АКТУАЛЬНА
ТРАНЗІТ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА 2 стар.
АБІТУРЫЕНТ–2004
НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ВНУ 2 стар.
ВЕСТКІ З СУПОЛАК. КАЗАХСТАН 3 стар.

НАПЯРЭДАДНІ
ФОТАМАСТАКІ СТВАРАЮЦЬ ТВОРЧЫ САЮЗ 4 стар.
ДЫПКУР'ЕР 3 стар.
ВЕРНІСАЖ
"ТЭМЫ" МАСТАКА Станіслава КІЧКО 4 стар.

КАНТАКТЫ І ДЫЯЛОГІ 5–6 стар.
З ПОШТЫ Яўгена ЛЕЦКІ
ПОЛЬСКІЯ ЎРАЖАННІ АБ XXX СУСТРЭЧЫ СЛАВЯНСКАЙ МОЛАДЗІ 7 стар.
ДЭБЮТ
КАЗКІ Ірыны ШПАКОЎСКАЙ 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА **РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ**

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі **Выдаецца з 6 красавіка 1955 года**

11 снежня 2003 года, № 50 (2868) Цана 175 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

ПРЭЗІДЭНТ СУСТРЭЎСЯ З ДЭПУТАТАМІ

Адна з найважнейшых задач, якая стаіць перад краінай і ўрадам на 2004 год, – гэта мадэрнізацыя эканомікі, аб'ём інвесціравання ў якую павінен павялічыцца не менш як на 20 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам.

Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў. У цэнтры ўвагі былі пытанні, звязаныя з прыняццем бюджэту на будучы год.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, ён па традыцыі сустракаецца з дэпутатамі двойчы на год — калі выступае з пасланнем да парламента і беларускага народа і другі раз, каб абмеркаваць шэраг пытанняў. На думку Аляксандра Лукашэнкі, на гэты раз дэпутаты ў адрозненне ад мінулых гадоў вельмі актыўна працавалі з урадам пры распрацоўцы бюджэту на будучы год і належным чынам падрыхтаваліся да прыняцця гэтага важнага дакумента. Прэзідэнт адзначыў, што калі дэпутаты маюць намер павялічыць фінансаванне па якіх-небудзь накірунках, то павінны рэальна прапаноўваць крыніцы, адкуль гэтыя грошы ўзяць. Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз акцэнтаваў увагу на важнасці задач, якія трэба ажыццявіць у наступным, вызначальным годзе гэтага пяцігадовага перыяду, бо ад яго залежыць развіццё нашай краіны ў перспектыве.

ЦЭНТР ПАДЗЕЙ — ВІСКУЛІ

Фота БелТА.

1991 год — кіраўнікі суверэнных дзяржаў: Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Украіны — падпісалі пагадненні аб дэнансацыі дагавора аб стварэнні Саюза ССР ад 1922 года і аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (дакументы падпісаны ў рэзідэнцыі Віскулі ў Белавежскай пушчы).

ЭКСКЛЮЗІЎНЫ "БРЫЛЬЯНТ БЕЛАРУСІ"

Калектывам рэспубліканскага алмазаапрацоўчага унітарнага прадпрыемства "Гомельскае ВА "Крышталь" пачата падрыхтоўка вытворчасці унікальных ювелірных вырабаў, у якіх будуць выкарыстаны ювелірныя ўстаўкі з найноўшага айчыннага матэрыялу – алмазоту.

Серыйны выпуск гэтага звышцвёрдага высокатэхналагічнага штучнага матэрыялу пачаты пад Мінскам, дзякуючы актыўнай падтрымцы ўрада краіны.

Для ювелірнай апрацоўкі алмазоту адбіраюцца толькі найлепшыя ўзоры яго, бездакорныя па памерах, структуры, якасці і колеру. У выніку атрымліваецца рарытэтнае сямейства ювелірных вырабаў, якое мае камерцыйную назву "Брыльянт Беларусі". Ён будзе забяспечваць ці пераўзыходзіць усе спажывецкія аптычныя якасці традыцыйных брыльянтаў, а вырабы з яго будуць адзінкавымі. Плануецца, што пастаўка эксклюзіваў першапачаткова будзе ажыццяўляцца толькі на айчынны рынак.

"ЮБІЛЕЙНЫЯ ЗВАНЫ" НІНЭЛЬ ШЧАСНАЙ

Персанальная выстава заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, вядомай мастачкі Нінэль Шчаснай праходзіць у Палацы мастацтва ў Мінску. На вернісажы прадстаўлена больш за 100 карцін. Прысвячаецца выстава 70-годдзю мастачкі і названа "Юбілейныя званы".

Нінэль Шчасная працуе ў жанры партрэта, пейзажа, нацюрморта, а таксама ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, у станковай і кніжнай графіцы. Яна стварыла цэлую галерэю партрэтаў нашых вядомых землякоў, сярод якіх Іван Шамякін, Іван Мележ, Пётр Клімук. Творы Нінэль Шчаснай не раз дэманстраваліся ў Беларусі і за мяжой. Яна ўзнагароджана медалём "За заслугі ў выяўленчым мастацтве" і з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Полацка.

РАЎБІЧЫ РЫХТУЮЦЦА ДА ЧЭМПІЯНАТУ ЕЎРОПЫ

У лютым будучага года ў алімпійскім спорткомплексе "Раўбічы" пройдзе чэмпіянат Еўропы па біятлону.

Тут праведзена рэканструкцыя зімовага стадыёна, пабудавана за кароткі тэрмін біятлонная траса. Яе шырыня ад шасці да васьмі метраў, што дазваляе праводзіць спаборніцтвы як па класічным зімовым біятлоне, так і летнія турніры па гэтым відзе спорту. Прыведзена ў парадак гасцінічная гаспадарка, абсталёўваюцца пляцоўкі для машын.

Нядаўна тут пабывалі эксперты Міжнароднага саюза біятланістаў і высока ацанілі падрыхтоўку да мерапрыемства.

Падрыхтавала **Галіна ВІДАНАВА.**

справы вясковыя

Фота БелТА.

НАВАСЁЛ З СУМАРОКАВА

Сельскагаспадарчае прадпрыемства "Авангард", што ў Магілёўскім раёне, вядзе актыўнае будаўніцтва жылля.

У вёсцы Сумарокава ўзводзіцца пасёлак з 12 дамоў для галоўных спецыялістаў гаспадаркі. У снежні здадзены ў эксплуатацыю 4 двухпавярховыя жылыя дамы і закладзены падмурак яшчэ двух.

НА ЗДЫМКУ: інжынер Васіль СТЭЛЬМАХАЎ з сям'ёй ужо пераехаў у новы дом.

зваротная сувязь

РАСІЯ – ЦЮМЕНЬ

МАРА ЗБЫЛАСЯ

Добры дзень, паважаная рэдакцыя газеты "Голас Радзімы"!

Трымаю ў руках вашу газету з матэрыялам Іны Кандаўравай "Там, за Уралам, — Белая Русь..." Дзякуй!

Паездка ў Беларусь для нашага калектыву — падарунак лёсу. Мы вельмі доўга ішлі да гэтага. А якім было наша шчасце, калі нас пачулі. Ну што ж, мара збылася! Цяпер мы расказваем пра нашу паездку, пра свае ўражанні на старонках нашых газет: і раённай, і абласных.

Так атрымалася, што ў лютым 2003 года я напісала ў газету "Тюменская правда сегодня" пра сваю вёску, сваю мару, а ў пачатку ліпеня гэтага года паведаміла, што варта марыць, што збылася наша мара! Пра гэтую цудоўную паездку расказвалі журналісты газет "Тюменские известия" (Наталля Цераб) і "Красная звезда" (Валянціна Хакімава).

У нашых жанчын да гэтага часу гараць вочы, калі згадваюць, як была арганізавана паездка, як нас сустрэлі і як нам пашанцавала, што побач з намі быў выдатны чалавек, які сагураў сваёй добразычлівасцю, непасрэднасцю, уражваў веданнем гісторыі Беларусі. Гэта Уладзіслаў Мантвідас. З ім адчувалі сябе, як дома!

Хачу сказаць, што ўразіла дабрыня ўсіх, хто сустрэўся нам у Беларусі. Дзякуй усім за гэта! Дзякуй жыхарам вёскі Шэйка Крупскага раёна за гасціннасць. Дзякуй жыхарцы гэтай вёскі Ніне Сёмінай за песню, якой нас навучыла. Яна назаўсёды застанецца ў нашым рэпертуары.

Мы марым пра новую сустрэчу на зямлі беларускай. А пакуль пастараемся захоўваць традыцыі сваіх продкаў.

З павагай

Валянціна МІХНЕНКА,
кіраўнік ансамбля "Вячоркі",
в.Вікулава.

спорт

ЦЯЖКАЯ АТЛЕТЫКА. У канадскім Ванкуверы завяршылася першынство планеты, на якім разыгрываліся і алімпійскія ліцэнзіі.

Беларусы вярнуліся дадому з сямю ўзнагародамі: "золатам", "серабром" і пяццю "бронзамі". Дзякуючы гэтаму, прадстаўляць нашу краіну ў Афінах будуць пяць мужчын і тры жанчыны.

ХАКЕЙ. Мінскі клуб "Керамін" заваяваў права выступаць у суперфінале Кантынентальнага клуба. Гэта стала магчымым пасля перамогі нашых спартсменаў у Лінцы, дзе беларусы абыгралі фінскі "Йукурыт" — 4:1, мясцовы клуб "Блэк Уінгз" — 3:1 і падзялілі ачкі з казахстанскім "Казцінк-Тарпеда" — 1:1.

МАСТАЦКАЯ ГІМНАСТЫКА. Фінал Гран-пры ў аўстрыйскім Інсбруку завяршыў сезон спаборніцтваў у гімнастак. Апошні акорд выдаўся ўдалым для беларусак у практыкаваннях з мячом: Святлана Рудалава стала чацвёртай у мнагабор'і, а на рахунку Іны Жукавай сёмая пазіцыя ў гэтым відзе плюс "бронза" ў практыкаванні з мячом.

ФУТБОЛ. Стала вядома, што нацыянальная зборная Беларусі пад кіраўніцтвам Анатоля Байдачнага пачне адборачны цыкл да чэмпіянату свету 2006 года ў групе 5. Сапернікамі нашай дружыны будуць каманды Італіі, Славеніі, Нарвегіі, Шатландыі і Малдовы.

НАСТОЛЬНЫ ТЭНІС. У Люксембургу, на кваліфікацыйным перадалімпійскім турніры вызначыўся другі спартсмен, які будзе прадстаўляць Беларусь у Афінах разам з Уладзімірам Самсонавым у адзіночным разрадзе. Уладальніцай запаветнай пуцёўкі стала Вікторыя Паўловіч, якая атрымала пяць перамог у пяці матчах.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

нумізматам

Фота БелТА.

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь 8 снежня 2003 года ўвёў у абарачэнне памятныя манеты "Спаса-Праабражэнская царква" серыі "Помнікі архітэктуры Беларусі": сярэбраную – наміналам 20 рублёў і медна-нікелевую – наміналам 1 рубель.

Тыраж іх па 2 000 штук.

*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOŚCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВІНІ *

наша марка

ПРАДУКЦЫЯ 67 БЕЛАРУСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ПРЫЗНАНА ЛЕПШАЙ НА РЫНКУ РАСІІ

Лаўрэатамі конкурсу "Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі" сталі 67 айчынных прадпрыемстваў. Дыпломы пераможцам уручыў 28 лістапада ў Мінску намеснік старшыні Дзяржстандарту Расіі Уладзімір Круцікаў.

На расійскім рынку прызнаны лепшымі харчовыя тавары ААТ "Камунарка", Рагачоўскага малочна-кансервавага камбіната, прамысловыя спажывецкія тавары ААТ "Мотавела", РУП "Віцязь", ЗАТ "Маладзечнамэбля", СП "Беліта", "Бархім", ЗАТ "Добрушскі фарфоравы завод". Адзначана прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння БелАЗа, Беларускага цэментнага завода, "Гомсельмаша", ТАА "Завод аўтамабільных прычэпаў і кузаваў "МАЗ-Купава", ААТ "Магілёўхімвалакно" і шэрагу іншых прадпрыемстваў.

Удзел у конкурсе дае магчымасць беларускім прадпрыемствам заявіць аб высокай якасці сваёй прадукцыі і прадставіць шырокую гаму вырабаў на рынках рэгіёнаў Расіі. Інфармацыя аб прадпрыемствах-лаўрэатах размяшчаецца ў спецыяльным раздзеле каталога "100 лепшых тавараў Расіі".

Пераможцы атрымаюць таксама права выкарыстоўваць лагатып конкурсу на прадукцыі, упакоўцы, у дакументацыі і рэкламных матэрыялах.

Лілія КРАПІВІНА, БелТА.

СВАЯ ВІЯГРА — ТАННЕЙШАЯ

На фармацэўтычным рынку Беларусі з'явіўся прэпарат "Патэнцагра", які прызначаны для стымуляцыі палавой актыўнасці ў мужчын. Ён выпушчаны ў ААТ "Белмедпрэпараты" і з'яўляецца аналагам шырока вядомай віягры.

Як расказала начальнік лабараторыі лекавых сродкаў Навукова-фармацэўтычнага цэнтра ААТ "Белмедпрэпараты" Людміла Дунец, праведзеныя параўнальныя выпрабаванні беларускага прэпарата і таблеткі "Віягра" фірмы "Пфайзер" паказалі іх біяэквівалентнасць. Патэнцагру з асцярожнасцю трэба прымяняць людзям, якія пакутуюць на ішэмічную хваробу сэрца, гіпертанію, сардэчную недастатковасць, артэрыяльную гіпертэнзію, маладым людзям, якія не дасягнулі 18 гадоў, папярэджваюць фармацэўты. Кошт патэнцагры ў некалькі разоў ніжэйшы ў параўнанні з імпартнымі аналагамі.

дабрачыннасць

"УСМЕШКА" ДОРЫЦЬ НАДЗЕЮ

Кіраўнікі замежных дабрачынных арганізацый Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі і Італіі прынялі ўдзел у свяце "Усмешка", якое прайшло ў мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў. Мэта гэтага штогадовага свята – падарыць дзецям, якія пакутуюць на анкагематалагічныя захворванні, надзею на выздараўленне. Перад дзецьмі выступілі дзіцячыя творчыя калектывы, было шмат гульняў, конкурсаў, сюрпрызаў і падарункаў.

Старшыня таварыства "Дзеці ў бядзе" Яўген Украінцаў, выступаючы на адкрыцці канцэрта, з жалем канстатаваў, што з кожным годам колькасць хворых павялічваецца. Так, у 2001 годзе было прынята 175 заяў, у 2002 — 245.

Яўген Украінцаў выказаў сардэчную ўдзячнасць усім, хто аказвае дапамогу хворым дзецям. Словы шчырай падзякі ён адрасаваў прадстаўнікам замежных дабрачынных арганізацый, а таксама Дэпартаменту па гуманітарнай дзейнасці Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрству працы і сацыяльнай абароны, адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска, Беларускаму нацыянальнаму тэхнічнаму універсітэту, кандытарскай фабрыцы "Камунарка", работнікам Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў.

Марыя АГАФОНАВА, БелТА.

здарэнні

САМАЛЁТ,

ЯКІ РАЗБІЎСЯ ПАД ГРОДНАМ, ІДЭНТЫФІКАВАНЫ

У Гродзенскім раёне знойдзены разбіты самалёт. Нумар яго рухавіка супадае з нумарам вышукваемага з сакавіка гэтага года літоўскага лятальнага апарата.

Аб гэтым паведаміў пракурор Гродзенскай транспартнай пракуратуры Вячаслаў Шэцік. Паводле яго слоў, цяпер на месцы здарэння працуе камісія Дзяржкамавіяцыі, якая прыбыла з Мінска. "Аб прычынах аварыі можна будзе гаварыць толькі праз два-тры месяцы. Палова самалёта згарэла, спецыялісты даследуюць дэталі, якія засталіся", — сказаў В.Шэцік, падкрэсліўшы, што ён "цалкам выключае верагоднасць таго, што лятальны апарат збілі".

Асобы пілотаў не ўстаноўлены. В.Шэцік лічыць, што для іх ідэнтыфікацыі спатрэбяцца аналізы блізкіх сваякоў".

Між тым, месца крушэння самалёта наведала Генеральны консул Літвы ў Гродне Д. Мацкувене. Журналістам яна паведаміла, што вясной гэтага года ў літоўскіх СМІ з'явілася інфармацыя аб знікненні літоўскага самалёта, якім кіраваў літовец Тадас Валкаўскас, па заяве маці якога ў Беларусі была ўзбуджана крымінальная справа па вышуку прапаўшага.

Паводле слоў жыхароў вёскі Маркішы, паблізу якой упаў лятальны апарат, месца выяўлення самалёта небяспечнае для прагулак. Менавіта гэтым у пракуратуры тлумачаць той факт, што самалёт, які разбіўся, не быў знойдзены адразу пасля крушэння.

Канстанцін СЕЛЬСКІ.

актуальна

"БЕЛАРУСКІ ТРАНЗІТ" ВАЖНЕЙШЫ ЗА ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ?

АБ'ЁМЫ ТРАНЗІТУ ГАЗУ І НАФТЫ ПРАЗ БЕЛАРУСЬ ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА

У Мінску прайшоў семінар для прадстаўнікоў беларускіх і расійскіх СМІ "Беларускі транзіт". У час, калі ў Расіі актыўна ішла выбарчая кампанія, 23 журналісты знайшлі магчымасць прыехаць у Мінск, каб абмеркаваць разам з беларускімі калегамі вышэйзгаданае пытанне.

Расія — самы буйны рынак збыту беларускіх тавараў і паслуг, у першую чаргу, транзіту. На долю Расіі ў 2002 годзе прыпадала 57,9 працэнта агульнага аб'ёму знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь. У сваю чаргу, Беларусь заняла другое месца ў знешнегандлёвым абароце Расіі, саступіўшы толькі Германіі.

Большасць (80 працэнтаў) транзітных грузаў, якія перасякаюць нашу тэрыторыю, ідуць у Расію ці адтуль. Геаграфія экспартных перавозак вызначаецца перавозкамі ў Расію, Украіну, Польшчу, Латвію, Літву. Характэрна, што па ўсіх накірунках іх колькасць павялічваецца. Што ж тычыцца Расіі, то ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года рост транзіту ў Расію і з Расіі павялічыўся і склаў 123 працэнты.

Транзіт аўтамабільным транспартам праз тэрыторыю нашай краіны ажыццяўляюць перавозчыкі больш як 45 дзяржаў. Перавозкі, звязаныя з Расіяй, займаюць значнае месца ў агульнай колькасці.

Яшчэ адзін від беларускага транзіту — нафта і газ, якія па трубаправодах перапраўляюць аб'яднанні "Белтрансгаз" і Беларускі дзяржаўны канцэрн па нафце і хіміі. "Белтрансгаз" эксплуатуе каля 7 тысяч кіламетраў газаправодаў, 6 газакампрэсарных станцый, 2 — падземнага захоўвання газу, 7 газавымяральных станцый. За бягучы год праз нашу тэрыторыю будзе прапампавана 31,7 мільярда кубічных метраў расійскага прыроднага газу, што вышэй за мінулагодні паказчык на 15 працэнтаў. Рост аб'ёмаў звязаны з павелічэннем аб'ёму транспарціроўкі газу па ўчастку расійскага газаправода "Ямал—Еўропа".

Павялічваюцца таксама аб'ёмы перапампоўкі нафты. За 9 месяцаў 2003 года фізічны аб'ём перапампаванай па Беларусі нафты павялічыўся на 7 працэнтаў і склаў 75 мільёнаў тон.

Алена СПАСЮК.

рэха падзеі

УЗНАГАРОДЫ ЗА СВЯТА

Свята – Дзень Беларускага пісьменства – равеснік незалежнасці Беларусі. Яно стала адным з самых любімых.

А дзесятае, юбілейнае, якое прайшло ў гэтым годзе ў Полацку, было арганізавана на самым высокім узроўні. Яно атрымалася дзякуючы намаганням многіх людзей: паліграфістаў, выдаўцоў, артыстаў, чыноўнікаў, журналістаў, рабочых, зазначыў міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч на сустрэчы з журналістамі, падчас якой ён уручаў па заданні Прэзідэнта, урада Беларусі ўзнагароды тым, хто асабліва вызначыўся ў падрыхтоўцы Дня пісьменства ў Полацку.

Сярод адзначаных — Уладзімір Тачыла, старшыня Полацкага гарвыканкама, якому была выказана падзяка Прэзідэнта "За вялікі ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё горада Полацка, падрыхтоўку і правядзенне ў горадзе Дня беларускага пісьменства і ўручаны імянны гадзіннік.

Ганаровай граматай Савета Міністраў узнагароджана намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч за значны асабісты ўклад у падрыхтоўку і правядзенне на высокім арганізацыйным узроўні гэтага свята.

За арганізацыю работы вяшчальнага модуля Беларускага радыё на свяце Ганаровых грамат Міністэрства інфармацыі ўдастоены Уладзімір Мартынаў, генеральны дырэктар вяшчання Беларускага радыё, і Навум Гальпяровіч, намеснік дырэктара Дырэкцыі радыёстанцыі "Беларусь". Пісьменніца Ніна Загорская "За актыўную работу па падрыхтоўцы і правядзенні X Рэспубліканскай навукова-творчай экспедыцыі "Дарога да святыняў" з Благадатным Агнём ад Труны Гасподняй" (мы падрабязна пісалі аб гэтым у «ГР» № 43 ад 23 кастрычніка 2003 года) і іншыя.

Як сказаў пісьменнік Навум Гальпяровіч, усе добра папрацавалі на свята, а найлепшы падарунак падрыхтавалі выдаўцы — цудоўную кнігу "Там, дзе вежы Сафіі", у якой сабраны творы полацкіх пісьменнікаў, пачынаючы ад Ефрасінні Полацкай да сучасных.

У наступным годзе Дзень пісьменства пройдзе ў старажытным Тураве, і трэба зрабіць усё, каб ён быў на прыступку вышэйшы, пажадаў Уладзімір Русакевіч.

Таццяна КУВАРЫНА.

ракурс

ПАСЛЫ ЗАЗІРНУЛІ Ў ЗАЎТРА

Фота БелТА.

У Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў Мінску прайшла сустрэча прадстаўнікоў дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў Беларусі, з творчымі калектывамі цэнтра. Дыпламаты пазнаёміліся з народнай творчасцю нашай краіны праз прызму унікальных работ, створаных дзецьмі ў цэнтры мастацкай творчасці.

НА ЗДЫМКУ: дыпламаты ў час наведвання гурткоў народнай творчасці з цікавасцю далучаліся да вытокаў беларускай культуры.

абітурыент-2004

НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ВНУ

Міністэрства адукацыі зацвердзіла адзіныя правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі ў 2004 годзе.

Новыя правілы прыёму аднолькавыя як для дзяржаўных, так і прыватных ВНУ краіны без выключэння. Акрамя таго, у 2004 годзе ў краіне пройдзе абавязковы экзамен па рускай (беларускай) мове, які аб'яднае ў сабе выпускныя і ўступныя выпрабаванні. Ужо вызначаны і дні. Праверыць свае веды па беларускай мове можна будзе 30 мая, па рускай — 6 чэрвеня. Пашырана таксама кола прадметаў, па якіх пройдзе цэнтралізаванае тэсціраванне. Гэта фізіка, матэматыка, біялогія, хімія, англійская і нямецкая мовы.

Дарэчы, у 2004 годзе ўпершыню ў якасці эксперымента ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт абітурыентаў будуць прымаць толькі па выніках тэсціравання.

Канстанцін СЕЛЬСКІ.

весткі з суполак

КАСТАНАЙ. КАЗАХСТАН

МЫ З ТАБОЙ, РОДНАЯ БЕЛАРУСЬ...

Горад ляжаў у руінах. Ішоў дробны і нейкі плакучы дожджык. На ўцалелых будынках цэнтральнай вуліцы сапёры развесілі шчыты з надпісам "Замініравана"... Пад нагамі біты шчэбень, шкло, цэгла, плавіўся ад пажараў асфальт. А мінчане гэтага не заўважалі, яны сустракалі нас усмешкамі і слязамі, стараліся паціснуць руку салдату-вызваліцелю. Мы апускалі галовы, лічачы сябе вінаватымі ў тым, што дапусцілі фашысцкую акупацыю. З намі ішоў старшына Новікаў, які толькі што бачыў у сваім доме (і мы гэта бачылі) на ўскрайку Мінска павешаных бацькоў...

Гэта быў ліпень 1944 года. Ці можна забыць такое і не расказаць пра гэта сённяшнім дзецям і ўнукам?! Таму хадзілі і ходзяць па школах, інстытутах, тэхнікумах, Дамах культуры мае землякі: К.Актанаў, Я.Перальман, П.Папоў, А.Пушкароў, В.Папоў, П.Шчарбіна, А.Пігароў, К.Панфілаў, Р.Палоўнікава, З.Чаркесава, Р.Цімашова і многія іншыя.

...Атрымалася так, што, не згаворваючыся, сталі ў адзін строй Кастанайскага нацыянальнага культурнага цэнтра "Беларусь" многія беларусы, якія пражываюць на зямлі цаліннай, і карэнныя кастанайцы, што ў вогненным 1941 годзе адстойвалі зямлю Беларусі і вызвалялі яе ў слаўным 1944 годзе.

Наш цэнтр за шэсць гадоў паспеў зарэкамендаваць сябе як дзеючы цэнтр культуры Беларусі ў нашым краі. Ініцыятары пачалі з выдання сваёй газеты. А вось каб яна не была шэрагавай, вырашылі назваць яе "Зубр".

Прыемна, што тыднёвік у кіёсках прадаецца літаральна за некалькі гадзін. Газету можна купіць ва ўсіх раёнах вобласці і ў абласных цэнтрах Казахстана, а таксама ў Чэлябінскай, Курганскай і Арэнбургскай абласцях Расіі.

У Беларускім культурным цэнтры пастаянна праводзяцца мерапрыемствы. Напрыклад: "За здаровы лад жыцця", сустрэчы з ветэранамі-жанчынамі, першацаліннікамі, франтавікамі, мясцовымі паэтамі і кампазітарамі. Тут уручалі медалі "Партызаны Беларусі" і "50 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў". Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь Ларыса Пакуш (на здымку ў цэнтры) перадала нашаму цэнтру розныя беларускія вырабы, а ветэраны падарылі ёй свае кнігі, фотаздымкі і кветкі. Пасол падзякавала актывістам цэнтра за прапаганду жыцця і звычаяў беларускага народа.

Тут урачыста праходзіць уручэнне Ганаровых грамат выдатнікам 4-га класа 6-й школы, якія вывучаюць беларускую гісторыю і мову.

Ідзе адбор і падрыхтоўка адзінаццацікласнікаў для навучання па тэхнічных спецыяльнасцях у ВНУ Беларусі. Цэнтрам праводзяцца выставы дзіцячых малюнкаў "Мая Айчына" і "Беларусь святкуе". І яшчэ адно прыемнае мерапрыемства, якое праводзіць культурны цэнтр, — "За дастарханам усёй сям'ёй" (накрыты стол з далікатэсамі). Збіраюцца: беларусы, рускія, украінцы, татары, башкіры, мардва, яўрэі, — а значыць дэманструецца і разнасолле гэтых народаў. Тут жа ідзе размова пра народныя сямейныя традыцыі. Трэба таксама адзначыць, што ў фестывалі "Мой край родны" прымаюць удзел беларускія паэты і кампазітары, якія пражываюць у нашай вобласці. Не без дапамогі кіраўніцтва Беларускага культурнага цэнтра выйшлі ў свет кнігі "Батыры твайго краю", "Справы і людзі", "Зорны камень" і іншыя. У іх вядзецца расказ пра тых, хто мужна змагаўся з ворагам на беларускай зямлі.

У заключэнне скажам, што вялікую плённую работу ў Беларускім цэнтры праводзяць яго старшыня Леанід Шаўчэнка — актыўны член Асамблеі народаў Казахстана і прэзідэнт адкрытага акцыянернага таварыства "Кастанайпаліграфія" (яго ён узначальвае 25 гадоў) і сакратар цэнтра, беларуская прыгажуня і супрацоўнік газеты "Зубр" Людміла Машонкіна.

...Я часта бачу ў сне адзін і той жа кашмарны сон, ад якога крычу, абліваючыся потам, ускокваю.

...Бой у невялікай беларускай вёсцы Аніна Слабада не спыняўся і ноччу, грукат артылерыйскай кананады разносіўся пад чорным купалам небасхілу, пакідаючы за сабой вузкі чырванаваты след. Несліся трасіруючыя снарады, а фашысты ішлі на нас сцяной, паліваючы свінцом і агнём. Падалі мае сябры...

Ёсць у жыцці чалавека хвіліны, якія да самай смерці будуць трымаць у напружанні яго памяць. У мяне — гэта Аніна Слабада 6 жніўня 1941 года.

Іван ШЧАРБІНІН,

палкоўнік у адстаўцы, удзельнік баёў у Беларусі ў 1941 і 1944 гадах.

дыпкур'ер

АБМЕРКАВАНА СТАНОВІШЧА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ

У Польшчы адбылася сустрэча намесніка міністра замежных спраў Беларусі Аляксандра Сычова з намеснікам Дзяржаўнага сакратара ў канцылярыі Прэзідэнта Польшчы Анджэем Майкоўскім, а таксама з памочнікам Прэзідэнта Польшчы Станіславам Цёсакам. У сустрэчы прыняў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка.

Адбыўся зацікаўлены абмен думкамі па пытаннях развіцця двухбаковага супрацоўніцтва. Былі абмеркаваны праблемы, звязаныя з працай консульскіх устаноў Беларусі і Польшчы ва ўмовах візавых адносін, а таксама перспектывы пашырэння гандлёва-гаспадарчага тавараабароту.

Суразмоўцы абмяняліся думкамі аб сітуацыі са становішчам нацыянальных меншасцей (беларускай — у Польшчы і польскай — у Беларусі).

Бакі таксама засяродзілі ўвагу на неабходнасці прыняцця захадаў па мінімізацыі негатыўных наступстваў пашырэння ЕС і максімальнага выкарыстання звязаных з гэтым станоўчых момантаў.

ГЕРМАНІЯ ВЫДЗЯЛЯЕ КРЭДЫТНЫЯ ГАРАНТЫІ

Міністэрства замежных спраў Беларусі атрымала афіцыйнае паведамленне Міжведамаснага камітэта па экспартных крэдытных гарантыях Германіі аб рашэнні гэтага камітэта зноў стварыць незалежныя ад года скарыстання паручыцельствы ў памеры 75 мільёнаў еўра ў адносінах здзелак з Беларуссю з тэрмінам крэдыту больш як 360 дзён.

Пры выдзяленні крэдытнай лініі Міжведамасным камітэтам прадугледжваецца раўнамернае размеркаванне сродкаў сярод германскіх экспарцёраў — як правіла, не больш 5 мільёнаў еўра на праект.

Прадастаўленне крэдытных гарантый ФРГ па экспартных аперацыях з Беларуссю будзе мець вялікае значэнне для развіцця двухбаковых эканамічных адносін і надасць імпульс рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, якія маюць першараднае значэнне для эканомікі дзвюх краін.

ВЕЧАР БЕЛАРУСКА-ЯПОНСКАЙ ДРУЖБЫ

Адбыўся традыцыйны штогадовы вечар дружбы, арганізаваны Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Японіі пры садзейнічанні таварыства дружбы "Японія – Беларусь".

У мерапрыемстве прынялі ўдзел супрацоўнікі беларускай і расійскай дыпламатычных місій, прадстаўнікі японскіх чарнобыльскіх арганізацый і кампаній, якія ажыццяўляюць эканамічнае супрацоўніцтва з нашай краінай, а таксама члены таварыства дружбы "Японія — Беларусь".

На вечары прысутнічалі прадстаўнікі японскіх кампаній "Джукі", "Като", "Нісо Баекі", "Эрс Плэнінг", з якімі былі абмеркаваны перспектывы далейшага супрацоўніцтва.

У ходзе сустрэчы была ўзгоднена магчымасць правядзення да канца бягучага года візіту Часовага Паверанага ў справах Беларусі ў горадзе Акіта (Японія) для азнаямлення на месцы з дзейнасцю таварыства дружбы "Акіта — Беларусь", якое аказвае значную гуманітарную дапамогу нашай краіне, стасункаў з кіраўніцтвам прэфектуры Акіта і дзелавымі коламі ўказанага рэгіёна Японіі.

ГЕНЕРАЛЬНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ЮНІДА

Прайшла Генеральная канферэнцыя ЮНІДА (Арганізацыі ААН па прамысловым развіцці), у якой удзельнічалі дэлегацыі 172 краін і 19 міжурадавых арганізацый.

Беларускую дэлегацыю ўзначальваў Віктар Гайсёнак, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Аўстрыя — Пастаянны прадстаўнік пры міжнародных арганізацыях у Вене.

На пленарным пасяджэнні Генеральнай канферэнцыі выступіў намеснік старшыні Камітэта па навуцы і тэхналогіях пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Нядзелька. У дакладзе, у прыватнасці, было адзначана, што наша краіна валодае значным навукова-тэхнічным патэнцыялам і зацікаўлена ва ўзаемавыгадным супрацоўніцтве з ЮНІДА. Прыярытэты гэтага супрацоўніцтва былі замацаваны ў сярэднетэрміновай праграме Беларусь—ЮНІДА. Яе аснову складаюць жыццёва важныя праекты па камерцыялізацыі навукова-тэхнічных распрацовак энергаэфектыўнасці, садзейнічанні інвестыцыям, павышэнні канкурэнтаздольнасці.

БІЗНЕС-ФОРУМ У КІТАІ

У ходзе правядзення бізнес-форуму па пытаннях інвестыцыйнага супрацоўніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай, які праходзіў у рамках Дзён культуры нашай краіны, адбылася прэзентацыя ілюстраванага часопіса на кітайскай мове аб турыстычных рэсурсах Беларусі.

Выданне ажыццёўлена Пасольствам Рэспублікі Беларусь у КНР сумесна з Пекінскай кампаніяй па міжнародным тэхніка-эканамічным развіцці пры Кітайскім камітэце па садзейнічанні міжнароднаму гандлю.

У часопіс уключаны пералік асноўных славутых мясцін Беларусі, кароткае апісанне некаторых, карта іх геаграфічнага размяшчэння, варыянт праграмы наведвання Беларусі для кітайскіх турыстаў, а таксама каляндар выставачных мерапрыемстваў у Рэспубліцы Беларусь на 2004 год. Тыраж часопіса — 3 000 экземпляраў.

Прэс-служба МЗС.

жыццёвыя сюжэты

КОЛА ФАРТУНЫ

Эся Шур нарадзілася ў Магілёве ў 1934 годзе, затым была вайна, пасля вайны – вучоба (СШ № 1 горада Магілёва, Ленінградскі горны інстытут імя Пляханава). Як малады спецыяліст пасля атрымання дыплома паехала працаваць у Эстонію ў трэст "Эстонсланц" на шахту № 6, дзе і працавала да пенсіі. У 1993 годзе Эся Лазараўна стаяла ля вытокаў стварэння аб'яднання пенсіянераў у эстонскім горадзе Селамяй. Вяла актыўную работу па адстойванні правоў рускамоўных грамадзян у Эстоніі. Яна была арганізатарам больш як 200 пікетаў і мітынгаў, зрабіла фільм аб жыцці расіян у Эстоніі, піша кнігу. У кастрычніку яна вярнулася на жыхарства на радзіму ў Магілёў.

НА ЗДЫМКАХ: афіша фільма пра жыццё расіян у Эстоніі; у час пікетаў.

Фота БелТА.

вернісаж

ДРЭВЫ ПАД ЗВАНІЦАЙ

Ёсць амаль у кожнага мастака – і тое выверана жыццём – стрыжнёвая, аднойчы знойдзеная і аблюбаваная назаўжды тэма. І яны ўзаемна не здраджваюць адно аднаму. Мастак, у нашым выпадку графік, пашырае і паглыбляе свой выбар, а галоўная тэма падштурхоўвае свайго абранніка да новага кроку, каб падчас патаемнымі рухамі і вобразамі здзейсніцца на лістах творцы. І шмат у каго падобнае ўзаемадзеянне назіраецца праз гады, яно не мімалётнае і нелёгкадумнае, як матылёк у паветры. Не даводзілася цікавіцца, ці запыняўся думкай на самааналізе на гэты конт мастак Станіслаў Кічко, але ёсць надзейная ўпэўненасць, што да ўласных шасцідзесяці гадоў ён прыйшоў якраз "у тэме". А апошняя, можа падацца, ляжыць на паверхні, яна навідавоку – бяры, захапляйся, твары. Аднак не будзем спяшацца з высновамі.

Тым больш, калі адбыўся адвольны намёк на юбілейную дату, і напрошваюцца на аглядку некаторыя штрышкі мастакоўскага шляху. Родам Станіслаў Кічко са Шчучыншчыны. У свой час пасля службы ў войску, як сёй-той з яго калег па выяўленчым цэху, скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. І вось ужо трыццаць тры гады жыве і працуе ў горадзе на Нёмане, куды цягнула даўніна і дзе па сённяшні дзень спагадае творчай руцэ тутэйшая аўра. І амаль столькі часу ўдзельнічае мастак у выставах рознай значнасці і рангу ў розных геаграфічных пунктах — ад родных і сталічных сцен да галерэй замежных гарадоў з бездакорнай мастацкай рэпутацыяй, напрыклад, у Кракаве і Варшаве. Не прыхаваем і тое, што творы Станіслава Кічко ёсць (даніна павевам часу?) у прыватных калекцыях за мяжой: і тут геаграфічны ланцужок не з двума-трыма звёнамі-краінамі.

Аднак заглянем у творчую майстэрню графіка на пешаходнай гродзенскай вуліцы, якую гісторыя спакусна іменавала не раз і, пэўна, думала, што канчаткова. А на сценах той жа майстэрні тая ж гісторыя далучаецца да цябе абліччамі сваіх лепшых сыноў, абрысамі хрысціянскіх храмаў, выклікае адпаведныя эмоцыі, уражвае духоўным скарбам. Гэта на лістах Станіслава Кічко адкрытым тэкстам чытаецца мастакоўскае імкненне аднавіць, узняць з нябыту гвалтам парушанае або па душэўнай глухаце занядбанае. Вабілі мастака постаці мужныя і знакавыя, і ўвасабляў ён іх пяшчотна і загадзя паважна: Кастусь Каліноўскі і Валеры Урублеўскі, Фрэдэрык Шапэн і Эліза Ажэшка, Траўгут, Нарбуты, Тызенгаўз... А побач з людскімі абліччамі тое, што зноўтакі скажа само за сябе, — "Родны кут", "Памяць", "Навагрудак", "Стары і новы Гродна", а яшчэ і ўсеагульная "Месячная ноч".

Станіслаў Кічко, і гэта яму добра залічыцца, ніколі не імкнуўся ў кан'юнктурны шэраг. А мець уласны адметны почырк і карыстацца ім з належным гонарам на гістарычным (асабліва!) полі даецца не кожнаму. Мастак — заўсёды вандроўнік, толькі душа яго прывязана да родных каранёў, таму і рука з пэндзлем міжволі цягнецца да вечных абрысаў. А прыкладаў таму шукаць доўга не даводзіцца: Напалеон Орда, Язэп Драздовіч... Зусім няма ахвоты ставіць побач з імі Станіслава Кічко: збянтэжыцца, а то і пакрыўдзіцца. Але тым не менш, у нечым узяўшы прыклад з вялікіх папярэднікаў, вырашыў ён зрабіць серыю "Касцёлы Гродзеншчыны". І ўжо ўвасобіў — гэта не натуральныя замалёўкі — дзевяноста храмаў у тым, што празаічна завецца "змешанай тэхнікай", а найбольш замяшаў гэтыя найчасцей славутыя помнікі і знакі на сваёй падчас калажнай фантазіі, жорсткіх рэаліях і таленце. Гэтая Кічкова серыя, зразумела, не можа існаваць, дакладней, не змагла б, без канкрэтыкі, але галоўны яе матыў — людская мара пра неўміручасць. "Касцёл у Новым Дварэ" можа стацца вызначальнай старонкай памянёнай серыі. У творы моцна трымаюць пад сабою зямлю Боская сіла, людская краса і дрэвы, якія... пасадзіў сам мастак.

А гэта ўжо не толькі тэма, а нешта большае...

НА ЗДЫМКУ: "Гродзенская даўніна".

Юрка ГОЛУБ.

напярэдадні

МАСТАЦТВА ДАКУМЕНТАЛІЗМУ

БЕЛАРУСКІЯ ФАТОГРАФЫ СТВАРАЮЦЬ СВОЙ ТВОРЧЫ САЮЗ

Наш карэспандэнт сустрэлася са старшынёй аргкамітэта будучага аб'яднання Вадзімам КАЧАНОМ. Сам ён цікавы фотамастак, член Саюза дызайнераў. Першым пытаннем да яго было, чаму фатографы вырашылі аб'яднацца менавіта зараз. В.Качан расказвае:

— Калісьці ж трэба пачынаць. Зараз, на мой погляд, асаблівы час, калі фатаграфія інтэнсіўна развіваецца і тэхнічна, і творча. Яна вельмі відазмянілася. Яе галоўнай вартасцю па-ранейшаму застаецца дакументалізм. Але камп'ютэрная апрацоўка выяўленняў, іншыя тэхнічныя сродкі даюць шмат магчымасцей для эксперымента. У наш асяродак прыйшлі новыя людзі, і ўсе хочуць выхаду на нейкі новы ўзровень як самой фатаграфіі, так і яе ролі ў грамадстве. Тут і не абысціся без сур'ёзнай арганізацыі, якая аб'яднала б зацікаўленых прафесіяналаў.

– Аднак Беларусь мае свае фатаграфічныя традыцыі, ці не так?

— Сапраўды. Але многія, хто пачынаў тут, сталі вядомымі ў іншых краінах. Да прыкладу, прызнаныя майстры М.Напельбаўм, Я.Булгак. Дарэчы, маментальны фатаграфічны затвор, які даў магчымасць рабіць рэпартажныя здымкі, быў вынайдзены ў 1882 годзе віцяблянінам С.Юркоўскім.

Калі казаць пра менш даўнюю гісторыю, варта нагадаць 70–80-я гады мінулага стагоддзя. Тады фотаклуб "Мінск" ладзіў шэраг выстаў пад назвай "Фотаграфіка" і заявіў пра сябе не толькі ў былым СССР, але і ў далёкім замежжы. Валянцін Ждановіч, Міхась Жылінскі, Міхась Ананьін, Анатоль Дудкін — тыя, каго ўжо няма з намі. Сёння з таго пакалення фатографаў працягваюць працаваць і здзіўляць цікавымі знаходкамі Георгій Ліхтаровіч, Яўген Казюля, Віктар Ганчарэнка, Уладзімір Няхайчык. Фотаклуб "Мінск" працуе і сёння. Многія яго члены сталі ініцыятарамі стварэння аб'яднання фатографаў.

– Якія пытанні вы спадзеяцеся вырашыць з дапамогай сваёй арганізацыі?

— Галоўнае, што мы хочам зрабіць, — гэта папулярызаваць фатаграфію як мастацтва. Без пастаянна дзеючай фотаэкспазіцыі гэта вельмі складана. Та[illegible] бліжэйшая мэта — стварэнне галерэі. Для пачатку мы плануем падрыхтаваць зборную выставу нашых майстроў і паказаць яе па ўсёй краіне. У будучыні плануецца рэтраспектыўная экспазіцыя з паказам работ беларускіх фатографаў з дня з'яўлення фатаграфіі на Беларусі (а вядомая яна тут з 1860-га года) да сённяшняга дня. Ужо ёсць дамова з Нацыянальным музеем гісторыі і культуры пра план выстаў, што павінны паказаць там нашы фатографы.

– Хто стане членам вашай арганізацыі?

— Прафесіяналы, якія працуюць у самых розных жанрах. Фатограф — аб'ёмнае паняцце. Ён можа працаваць у журналістыцы, мастацкай, рэкламнай, бытавой фатаграфіі. Ёсць тыя, хто здымае толькі фауну і флору. У Брэсце, да прыкладу, цэлая група фатографаў-арнітолагаў. Мы імкнемся, каб у нашым аб'яднанні былі прадстаўлены розныя фатаграфічныя напрамкі.

— Заканчэнне на 8-й стар. —

спадчына

МУЗЕЙ ТЫШКЕВІЧАЎ

У СТАРАЖЫТНЫМ ЛАГОЙСКУ

У жыцці старажытнага Лагойска 160 з лішкам гадоў таму адбылася падзея, якая залатым радком пазначана ў гісторыі айчыннай культуры. Тады, у 1842 годзе, у велічным палацы па-над ракой Гайнай, адкуль выйшлі ў вялікі свет славутыя нашы землякі Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы, быў адкрыты першы ў Беларусі музей старажытнасцей. Зборы старажытнасцей былі (у Нясвіжы), а музея – не было.

Праз колькі часу вядомы археолаг Адам Кіркор пісаў: "Па колькасці прадметаў і высокім навуковым значэнні музей гэты можна параўнаць толькі з Віленскім і Кракаўскім пры Ягелонскім універсітэце". І гэта было сказана пасля таго, як стараннямі Яўстафія Піевіча ў 1855 годзе быў заснаваны Віленскі музей старажытнасцей, куды трапіла значная частка лагойскіх калекцый.

Стварэнню ж лагойскага музея папярэднічала вялікая, нястомная, сапраўды падзвіжніцкая праца братоў Тышкевічаў, якія былі аб'яднаны агульнай справай, прысвяцілі свае сілы і здольнасці глыбокаму вывучэнню мінуўшчыны роднай зямлі. Сферай іх дзейнасці сталі археалогія і этнаграфія, краязнаўства і фальклярыстыка.

Канстанцін Піевіч (1806–1868), на працягу жыцця даследаваў каля 200 курганоў, гарадзішчаў і замчышчаў у заходняй частцы Міншчыны, у тым ліку на Лагойшчыне, склаў першыя тапаграфічныя карты іх. Вынікі даследаванняў падрабязна апісваў і публікаваў у расійскіх і польскіх выданнях. У 1856 годзе арганізаваў экспедыцыю па рацэ Віліі, што дало магчымасць сабраць багаты этнаграфічны матэрыял. Потым, у 1871 годзе, апісанне падарожжа выйшла ў Дрэздэне асобнай кнігай.

Як і брат, аддана служыў навуцы Яўстафій Тышкевіч (1814–1878). Ён таксама даследаваў курганы на Міншчыне і ў Літве. Сярод яго шматлікіх навуковых прац — грунтоўнае даследаванне "Апісанне Барысаўскага павета", дзе змешчаны разнастайныя звесткі па эканоміцы, культуры, этнаграфіі.

Матэрыялы, назапашаныя за многія гады пошукавай, краязнаўчай, даследчыцкай працы Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, і склалі экспазіцыі адкрытага ў Лагойску музея. Тут былі сабраны, напрыклад, звыш тысячы старажытных грамат, рукапісных матэрыялаў па гісторыі Вялікага княства Літоўскага, калекцыя медалёў і манет (больш за 1 100 экземпляраў). Экспанавалася і багатая калекцыя старадаўняй зброі, у ліку якой была шпага Пятра I і два мячы з мініяцюрнай выявай караля Стэфана Баторыя. Захоўваліся кальчугі, мундзіры часоў Айчыннай вайны 1812 года. У аддзеле мастацтваў мелася больш за 200 карцін і эскізаў беларускіх, рускіх і польскіх мастакоў. Партрэты прадстаўнікоў 12 пакаленняў роду Тышкевічаў займалі ўсю сталовую залу палаца. Выключную каштоўнасць сярод мастацкіх вырабаў меў вялікі крыж з серабра і золата, які польскі кароль Сігізмунд I Аўгуст падарыў касцёлу мястэчка Гайна ў 1514 годзе.

На вялікі жаль, прыходзіцца канстатаваць: усё гэтае багацце назаўсёды страчана для Лагойска. Лагайчан непакоіць, што ў сучасным райцэнтры амаль нішто не нагадвае пра яго былую славу. Хіба што рэшткі сцяны правага крыла палаца ды земляны вал, які ўзвышаецца наўсцяж старажытнага замчышча...

Выправіць гэтую гістарычную несправядлівасць і прызваны будзе новы гісторыка-краязнаўчы музей, работа над стварэннем якога цяпер актыўна вядзецца. Плануецца, што тут будзе абсталяваны мемарыяльны пакой, прысвечаны братам Тышкевічам. Для таго ж, каб на належным узроўні ўшаванаць іх памяць, паказаць будучым наведвальнікам веліч, маштабнасць здзейсненага гэтымі рыцарамі навукі, спатрэбіцца сабраць вялікую колькасць экспанатаў.

Праўда, ужо многае ўдалося займець. І перш за ўсё, дзякуючы нашаму земляку Уладзіміру Палупанаву, які перадаў каштоўныя матэрыялы пра Тышкевічаў. Ёсць некалькі архіўных дакументаў, фотаздымкаў, археалагічныя знаходкі на месцы ранейшага палаца Тышкевічаў каля вёскі Заазер'е, публікацыі з выданняў розных часоў. Гэтага яўна недастаткова, а таму пошукі будуць працягвацца.

Спадзяёмся, што ў высакароднай справе нам паспрыяюць, акажуць дапамогу прадстаўнікі беларускай дыяспары. Магчыма, адгукнуцца на гэтую публікацыю і нашчадкі Тышкевічавага роду, прыслухаюцца да нашай просьбы даслаць для лагойскага музея дакументы і рэчы, друкаваныя выданні, што датычаць жыцця і дзейнасці як саміх Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, так і іншых прадстаўнікоў славутага роду. Любое канкрэтнае праяўленне ўвагі да распачатай справы па стварэнні лагойскага музея, адкрыццё якога плануецца прымеркаваць да 200-годдзя з дня нараджэння К.П.Тышкевіча (2006), будзе намі ўспрынята з вялікай удзячнасцю.

Наш адрас:

223110, вул.Савецкая, 13, г.Лагойск Мінскай вобласці, Рэспубліка Беларусь.

Віктар НЕСЦЯРОВІЧ.

КАНТАКТЫ І ДЫЯЛОГІ

ВЕСТКІ МІЖНАРОДНАЙ АСАЦЫЯЦЫІ БЕЛАРУСІСТАЎ. № 22

Прэзентацыя

Уладзімір Караткевіч запрашае... на свой сайт

Пачалося ўсё даволі даўно. Калі ў 1980 годзе Уладзімір Караткевіч адзначаў сваё 50-годдзе і быў у сувязі з гэтым узнагароджаны ордэнам Дружбы Народаў, яго часта запрашалі на аўтарскія сустрэчы. Адну з іх правялі інжынерныя работнікі завода "Інтэграл" – у кінатэатры "Электрон". Зала была паўнюткая, пытанняў было многа, кветак і сувеніраў – таксама. Памятаецца, вярнуўшыся адтуль, пісьменнік, якога мы тады трохі жартам, а трохі ўжо і ўсур'ёз называлі "клясыкам" (а сёння ён па праву стаў ім), узрушана сказаў:

— Слухайце, хлопцы, нешта змяняецца да лепшага. У беларускай паэзіі пачынаюць разбірацца не толькі "лірыкі", але і "фізікі". Бо за кім жа будучыня, як не за электроншчыкамі? Трымайце з імі сувязь.

Сувязь усталявалася самая цесная. І не толькі са мною, але і з іншымі сябрамі Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, у тым ліку і зарубежнымі. У 2000 годзе, калі адзначалася сямідзесяцігоддзе з дня нараджэння У. Караткевіча, у Мінскім прафесіянальна-тэхнічным каледжы, што на вуліцы Казінца, адчыніў свае дзверы даволі багаты музей пісьменніка — першы ў Беларусі, крыху ранейшы, чым аршанскі. Выступаючы тады ад імя нашай асацыяцыі, я прапанаваў, не зусім яшчэ верачы ў поспех:

— Каму ж, як не вам, стварыць першае электроннае выданне спадчыны Караткевіча?!

Прайшлі тры гады. І вось 26 лістапада, у дзень нараджэння пісьменніка, у тым жа каледжы адбылося ўрачыстае адкрыццё прысвечанага яму сайта "Быў. Ёсць. Буду". У яго меню — усе вядомыя творы Караткевіча ў арыгінале, а некаторыя — і ў перакладах, яго лісты, малюнкі, працы, прысвечаныя пісьменніку (у тым ліку — манаграфіі), водгукі ў друку. Усяго — каля 30 мегабайтаў інфармацыі. Уводзілі яе тры гады, чатыры тысячы гадзін. Кіраваў справай апантаны энтузіяст, выкладчык беларускай мовы і літаратуры ў каледжы Пятро Жаўняровіч, ён жа грамадскі дырэктар музея, цяпер піша дысертацыю пра мову У. Караткевіча. Тэхнічны рэдактар праекта — навучэнка Алена Вальковіч. Увод інфармацыі быў для навучэнцаў, пераважна хлопцаў, вытворчай практыкай.

Пачалася вечарына дэманстрацыяй на экране некаторых старонак сайта, найперш — комікса, з жартам гумарам і самаіроніяй намаляванага самім Караткевічам. У час прагляду навучэнцы па чарзе дэкламавалі яго творы. Гучала любімая песня пісьменніка "Ой, косю, мой косю".

Першае слова пра Караткевіча сказала яго пляменніца Алена Сянкевіч. Яна ж уручыла музею падарунак. Затым слова ўзяў дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі акадэмік Уладзімір Гніламёдаў. Пра міжнародны розгалас спадчыны пісьменніка гаварыў караткевічазнавец кандыдат філалагічных навук Анатоль Верабей. Ад імя Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў музею былі перададзены пераклады твораў Караткевіча на рускую, украінскую, латышскую, літоўскую і польскую мовы. Некаторыя з іх, "Чазенія" і "Дзікае паляванне караля Стаха", зроблены сябрамі асацыяцыі Мірдзай Абала і Альмай Лапінскене. Гэтыя кнігі (кожная — з аўтографам аўтара або перакладчыка) увойдуць у экспазіцыю музея, дапоўняць сайт.

Стварэнне музея і сайта, правядзенне вечарыны былі б немагчымымі без штодзённай зацікаўленай падтрымкі дырэктара каледжа заслужанага работніка адукацыі Валерыя Хасіна.

Цікава, што яшчэ да адкрыцця сайта ў яго "Гасцёўню" трапілі і пакінулі тут свой след першыя наведвальнікі. Сярод іх — нашы суайчыннікі, у іх ліку публіцыст Раман Кардонскі (ЗША). Дарэчы, запішыце адрас сайта ў сусветным сеціве Інтэрнэт: http://uladzimir-karatkevich.iatp.by.

Такім чынам, створаны першы сайт беларускага пісьменніка. Па яго прыкладу, напэўна ж, узнікнуць наступныя. Гэта будзе садзейнічаць папулярызацыі нашай літаратурнай спадчыны ў Беларусі і ў свеце.

Адам МАЛЬДЗІС.

НА ЗДЫМКУ: стваральнікі сайта. Стаяць А. ВАЛЬКОВІЧ і П. ЖАЎНЯРОВІЧ.

Фота **Марыны ЗАЙЦАВАЙ.**

Ліставанне

МАНЕ змяніла свае каардынаты

Паколькі многія сябры Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў з'яўляюцца таксама правадзейнымі сябрамі або сябрамі-карэспандэнтамі Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, прашу паведаміць ім новыя – парыжскія (Iean Denegre@ensg.ign.fr) і маскоўскія (vgbondur@online.ru) – каардынаты. Спадзяюся, што перамяшчэнне галоўнай сядзібы ў Францыю, дзе знаходзіцца і штаб-кватэра ЮНЕСКА, паспрыяе плённай працы акадэміі, у тым ліку і Аддзялення культуралогіі і культуры суседніх народаў. Пасылаю прывітанні маім землякам.

Яўген ШЫРАЕЎ, акадэмік *(Масква)*.

Ідэі

Купала і Колас як сааўтары

Змяшчаем частку высока ацэненага ў СМІ выступлення эксперта Беларускага рэспубліканскага фонду "Узаемаразуменне і прымірэнне" малодшай унучкі Якуба Коласа Веры Міцкевіч на навуковай канферэнцыі "Публіцыстыка Якуба Коласа ў сістэме цэласнага рэалістычнага адлюстравання жыцця", якая адбылася ў рамках літаратурнага свята "Каласавіны" ў лістападзе 2003 года ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Паведамленне В.Міцкевіч датычылася розных аспектаў літаратурных публікацый на старонках газеты "Наша ніва", так ці інакш звязаных з класікам беларускай літаратуры.

На старонках "Нашай нівы" ў 1913 годзе адбылася вядомая дыскусія пра лёс беларускай літаратуры, распачатая артыкулам Юрыя Верашчакі (Вацлава Ластоўскага) "Сплачвайце доўг". Адказам на гэтую "свядомую правакацыю", як лічаць некаторыя крытыкі, найперш быў надрукаваны ў газеце артыкул "Чаму плача песня наша? (Адказ Юрцы Верашчаку)", а пасля яшчэ шэраг артыкулаў і літаратурных твораў. Гэтую дзялянку ўжо распрацоўвала шмат даследчыкаў і ў розных накірунках. Мяне ж зацікавіла аўтарства "Адказу..." На старонках штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" ў 1997 годзе, 10 студзеня, аб гэтым пісаў Алесь Пашкевіч у артыкуле "Гэта наша дарога". Як вядома, аўтарства артыкула "Чаму плача песня наша?" пад псеўданімам "Адзін з "парнаснікаў" доўгі час прыпісвалася Янку Купалу. Алесь Пашкевіч у якасці версій назваў таксама Вацлава Ластоўскага, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і выказаў думку, што "Адказ..." нібы "расколваецца" на дзве часткі.

"Думкі думку "параджаюць" — гэты коласаўскі радок з "Сымона-музыкі" абудзіў і мой інтарэс да пошукаў. Летась у артыкуле "Першая сустрэча Янкі Купалы і Якуба Коласа" (Роднае слова. № 8. С.98–99) мною схематычна была закранута версія "падвойнага" аўтарства "Адказу Юрцы Верашчаку". На маю думку, Я.Колас і Я.Купала маглі напісаць "Адказ..." па частках: першую — Я.Колас, другую — Я.Купала, а надрукаваць як адзіны матэрыял.

У чэрвені 1913 года, калі Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч і Марыя Дзмітрыеўна Каменская пабраліся шлюбам і паехалі ў вясельнае падарожжа ў Вільню, адбываліся іх сустрэчы з Янкам Купалам і ў Чыгуначнай калоніі (у родных жонкі Я.Коласа), і ў рэдакцыі "Нашай нівы". Магчыма, што Я.Колас і Я.Купала азнаёміліся з артыкулам "Сплачвайце доўг" яшчэ ў рукапісе ў рэдакцыі газеты. Зразумела, яны ўспрынялі яго як выклік ім абодвум і прыйшла ідэя адказаць разам. Магчыма, гэта быў першы вопыт сумеснай працы.

Адзін з важкіх аргументаў: пасля ж былі сумесныя артыкулы! Цытую Я.Коласа: "Будучы на курорце (Цхалтуба, Грузія, вясна, 1941 год. — **В.М.**) і дачуўшыся аб шырокай праграме па асушэнні беларускіх балот, мы (Я.Колас і Я.Купала. — **В.М.**) напісалі з гэтага поваду свой водгук на гэтую выдатную падзею ў жыцці нашай рэспублікі і паслалі яго ў адну газету, выходзіўшую ў Мінску" (рукапіс, сямейны архіў, скарочана — у 36. тв. Я.Коласа ў 14 т., у арт. "Янка Купала. Успаміны". Т.12. С.194). І яшчэ ў 1941 годзе: "У Маскве напісалі мы нашу апошнюю сумесную адозву да свайго народа" (рукапіс, сямейны архіў; скарочана: Там жа. Т.12. С.195). Гэтая апошняя адозва песняроў сёння прадстаўлена ў адноўленай экспазіцыі музея Якуба Коласа.

Вернемся ў 1913 год. Паэты раз'ехаліся з Вільні: Я.Колас — на Стаўбцоўшчыну, у Мікалаеўшчыну, Я.Купала — на Лагойшчыну, у Акопы. Летам 1913 года Я.Колас напісаў ліст ў рэдакцыю газеты "Наша ніва": "Цяпер пасылаю да Вас ліст з Мікалаеўшчыны. Мне здаецца, што гэты ліст надта павінен быць, як кажуць, "злободневен", бо гэта ўходзіць у тую старонку нашага жыцця, каторая завецца яго няўстройкаю" (36. тв. у 14 т. Т.13. С.25). Пра які ліст пісаў Я.Колас? Невядома. Але можна ўявіць, што гэта — частка "Адказу Юрцы Верашчаку".

Другі аспект погляду на аўтарства Я.Коласа ў першай частцы "Адказу..." — сама мова, яе стыль, іронія, ужытыя фразеалагізмы і нават асобныя словы.

Параўнаем. З артыкула "Чаму плача песня наша?": "Паявіліся паэты, песняры свайго, забытага Богам і людзьмі краю..."; з верша Я.Коласа "Наш родны край": "Ой, ты бедная старонка, // Ой, забыты Богам край!" З артыкула: "Не думайце, што "парнаснікі" не бачылі і не адчувалі ўсёй багатай красы нашай зямелькі з яе горамі, далінамі, рэчкамі і лясамі"; Я.Колас "Мой Запавет": "...мне не хочацца пакідаць вас, мае сябры, мае лясы, мае лугі, мае рэчкі, мае крыніцы..." У артыкуле прагучала любімае слова Я.Коласа "зямелька"... Прыгадаем безліч прыкладаў з твораў паэта, асабліва з паэм "Новая зямля" і "Сымон-музыка": "І чуткі ўсе наконт зямелькі", "Зямельцы неба ўсміхнецца", "Бо мы твае, зямелька, людзі!", "І зямелька ўжо вітае", "Ноч зямельку агарнула" і г.д.

Словы "Бог", "Божы", "Божа", як заўважана Алесем Пашкевічам, у першай частцы "Адказу..." напісаны з вялікай літары, у другой частцы — з маленькай. У рукапісе першай рэдакцыі паэмы Я.Коласа "Сымон-музыка" ўсе гэтыя словы выпісаны аўтарам з вялікай літары: "То, здавалась, анёл Божы// Небу скаргу пасылаў", "Волен ўсюды Божы свет", "Бацька выгнаў? Бойся Бога!"// Ты, як бачу, хлопчэ, лгар,// Добры жэўжык, прызнавайся?// — Не, ягомасць, як Бог свят..."

І каб паставіць кропку, а хутчэй, пытальнік: чаму ж падпісаны "Адказ..." псеўданімам "Адзін з "парнаснікаў", калі "парнаснікаў" было двое? У першую чаргу, такі подпіс даў Якубу Коласу магчымасць не быць пазнаным у вострай палеміцы, што было яшчэ небяспечна пасля нядаўняга турэмнага зняволення.

Вера МІЦКЕВІЧ.

Асоба

Этнамузыказнаўца Зінаіда Мажэйка

Першая навуковая манаграфія З.Мажэйкі "Песенная культура Беларускага Палесся" (1971) была для майго пакалення адкрыццём, мастацкім прарывам у глыбіню Палесся. Бо раней мы прызвычаіліся да самадзейных стылізацый пад хрэстаматыйны рэпертуар, дзе беларус выступаў гэткім добрым весялуном, напяваў соты раз адны і тыя ж матыўчыкі. А тут узнікла цэлае мора музычнай, вакальнай, паэтычнай мастацкай культуры трагічнага, драматычнага і камічнага дыяпазону са сваімі непаўторнымі рэгіянальнымі стылямі, унікальным палескім выкананнем.

Пазней у Зінаіды былі шматлікія экспедыцыі ва ўсе палескія рэгіёны, стацыянарнае вывучэнне народнай песні, жыцця і творчасці яе стваральнікаў і выканаўцаў у натуральным асяроддзі іх жыцця, у комплексе з каляндарнымі і сямейнымі абрадамі. Грунтоўна ўзнаўляліся традыцыйныя гурты спевакоў, ствараліся этнаграфічныя партрэты. Ад першых аспіранцкіх экспедыцый да цяперашняга статуса З.Мажэйкі — вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара мастацтвазнаўства, заслужанага дзеяча мастацтва Беларусі, члена Саюзаў кампазітараў і кінематаграфістаў — захоўваюцца ёю тры этапы даследавання фальклору. Гэта сяброўскае ўваходжанне ў асяроддзе таленавітых народных спевакоў, творцаў фальклору, потым расшыфроўка запісаў і тэарэтычнае асэнсаванне народнай песні ў кантэксце айчыннай і сусветнай фалькларыстыкі і этнаграфіі. І канчатковы вынік — практычна-мастацкая фалькларыстыка, арганізацыя этнамузычных канцэртаў, стварэнне сумесна з кінематаграфістамі дакументальна-мастацкіх фільмаў.

Прыгадаю толькі асноўныя працы, што склалі навуковую аснову беларускага этнамузыказнаўства. Апрача ўжо названай палескай кнігі, З.Мажэйка напісала і выдала манаграфіі "Каляндарна-песенная культура Беларусі: Спроба сістэмна-тыпалагічнага даследавання" (1985), "Беларуская этнамузыкалогія" (1998), навукова падрыхтавала зборнікі "Песні беларускага Паазер'я" (1981), "Песні беларускага Палесся" (вып.1–2, 1983–1984).

З.Мажэйка развівае ў Беларусі традыцыі этнамузычнай школы Яўгена Гіпіуса, класікаў беларускай этнамузыкалогіі і практычнай

— Заканчэнне на 6-й стар. —

Рэха публікацый

Як Яцэк Бітэль вярнуўся да сваіх вытокаў...

Улетку ў газеце "Голас Радзімы" (№ 34), у вестках "Кантакты і дыялогі", было надрукавана інтэрв'ю з гісторыкам-краязнаўцам Вікторыяй Жаўняровіч, якая нарадзілася на Магілёўшчыне, а цяпер жыве і працуе ў Літве, у прыгранічным Шумску.

Сярод іншага там закраналася пытанне і пра спадчыну польскага і беларускага мастака Льва Дабжынскага. Вучань славутага Фердынанда Рушчыца, пасля паспяховай выставы ў Вільні ён атрымаў адну на ўсю даваенную Польшчу прэстыжную стыпендыю для стажыроўкі ў Францыі. Але нечакана застрэліўся ў Лошы, спадчынным маёнтку яго маці, салісткі Пецярбургскай оперы, і быў там жа пахаваны каля капліцы (цяпер гэта Астравецкі раён Гродзенскай вобласці). Спасылаючыся на размовы са старымі жыхарамі Беларусі і Літвы, Жаўняровіч сцвярджала ў інтэрв'ю, што гэта было, хутчэй, не самазабойства, а забойства. І застрэліў мастака пан Расальскі з суседніх Рымуняў, які быў каханкам гаспадыні Лошы, маці, краў у яе маёнтку лес, каб заплаціць карцёжныя даўгі, а калі Леў Дабжынскі высачыў гэта і стаў пагражаць судом, расправіўся са сведкам.

З таго часу сям'я Дабжынскіх, якая пасля вайны жыла ў польскім горадзе Гданьску, найперш сястра мастака доктар медыцыны і пісьменніца Надзея Бітэль-Дабжынская, акружыла трагедыю флёрам таямнічасці, усё было спісана на нячыстую сілу, якая нібыта дзейнічала каля маёнтка. Такая аргументацыя гучала і ў час размоў беларусістаў з Мінска і Гданьска з гэтай жанчынай, аўтарам аповесці з сялянскага жыцця "Агрыпіха", дзе героі гавораць на польскай і беларускай мовах. Нічога пэўнага не сказала Н. Бітэль-Дабжынская і пра лёс багатай мастацкай спадчыны Л. Дабжынскага, якая, хутчэй за ўсё, засталася ў Вільні (у Беларусі, на Астравеччыне, былі толькі копіі гравюр). Паказала шэсць карцін свайго брата (у тым ліку яго аўтапартрэт), што віселі ў гасціным пакоі.

Такая перадгісторыя. Новае ж дзеянне пачалося тады, калі нумар "Голасу Радзімы" з інтэрв'ю трапіў на вочы гданьскай беларусістцы доктару сацыялогіі Алене Глагоўскай. Прачытаўшы яго, яна адразу ж накіравалася ў Літву, у Шумск, адшукала там спадарыню Жаўняровіч і вярнулася дамоў з акрэсленым планам. Найперш сустрэлася з сынам Н. Бітэль-Дабжынскай Яцэкам Бітэлем, уладальнікам прэстыжнага магазіна антыкварнай мэблі.

За доўгія гады пошукаў антыкварыяту Я. Дабжынскі аб'ездзіў усю Польшчу, пабываў у многіх заходнееўрапейскіх краінах. А вось на радзіме сваіх продкаў, у Беларусі, ён не быў ні разу. Нават не дужа ведае, чаму. Беларусь, роднасныя сувязі былі ў сям'і Бітэляў закрытай тэмай. Нават пра знакамітага дзядзьку Льва, названага так у гонар Льва Талстога, чуў ад маці вельмі нямнога.

Але з нечаканай прапановай Алены Глагоўскай, якая шмат гадоў падтрымлівала цесныя сувязі з Надзеяй Бітэль-Дабжынскай, паехаць разам у Беларусь Яцэк Бітэль згадзіўся адразу. Сказаў рашуча: "Едзем паслязаўтра або ніколі..." З дапамогай кваліфікаваных спецыялістаў за два дні зрабіў шэсць дакладных копій з карцін дзядзькі, якія захаваліся ў гданьскім доме.

Астравеччына здзівіла госця ветлівасцю і памяццю. У раённай бібліятэцы яго сустрэлі як добрага сябра: пазнаёмілі з матэрыяламі, прысвечанымі сям'і Дабжынскіх, напаілі кавай. Нават прыгадалі верш, напісаны ў дзявоцтве яго маці на беларускай мове. Пачынаўся ён радкамі:

Пакацілася восень аржышчамі
Паміж гоняў, між шэрых палос...

Яшчэ цяплейшая сустрэча чакала Яцэка ў Гудагайскай сярэдняй школе. Тут з ім правялі экскурсію па школьным музеі, дзе Льву і Надзеі Дабжынскім прысвечаны спецыяльны стэнд, адбыліся знаёмства з калектывам школы на чале з дырэктарам Віталем Лянкевічам, прыемная размова за накрытым сталом. А галоўнае — перадача твораў Л. Дабжынскага (на здымку Я.Бітэль стаіць злева).

І ўсё ж асноўнае і найбольш складанае для Яцэка было наперадзе. Яшчэ трэба было набрацца смеласці і адкрыць для сябе Лошу... Там гасцей ужо чакала сельскі бібліятэкар Соф'я Шаблоўская. Потым ён дакрануўся да рэшткаў збудаванняў былога маёнтка. Абхапіўшы рукамі калені, прысеў на траву, што вырасла на месцы дома, дзе жылі яго дзяды-прадзеды, а ў іх ліку расійскі сенатар Антон Дабжынскі, таксама пахаваны ў Лошы. На цвінтарышчы Яцэк запаліў свечкі. Пабачыўшы, што помнік, пастаўлены на магіле дзядзькі стараннямі Беларускага фонду культуры і аддзела культуры Астравецкага райвыканкама, сёння знаходзіцца ў стане, блізкім да аварыйнага, заказаў мясцоваму майстру, Антону Шафрану, новы — "у стылі, аднолькавым для пахаванняў Дабжынскіх". Стрыманы інтэлігент, ён тут не вытрымаў. Арыстакратычная вытанчанасць саступіла месца эмоцыям.

Увесь вечар Яцэк быў маўклівы. Але назаўтра зноў стаў сам сабой. Мы разам на яго машыне імгненна дабраліся да Ашмян, дзе вызначылі месца знаходжання гімназіі, у якой вучыўся госць. А потым паехалі на Смаргоншчыну, у ваколіцы Багданава, адкуль паходзіў Фердынанд Рушчыц і адкуль па ўсёй Беларусі і Літве прамянілася мастацкая аўра. Там, у Альшанцы, знайшлі і месца нараджэння Яцэка, і нават жывога стрыечнага брата яго бацькі. Усеўшыся за гасцінным вясковым сталом, устанавілі ўвесь радавод Бітэляў (прыгадаем, што з гэтага роду паходзіць і беларускі паэт, перакладчык на беларускую мову эпапеі Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш" Пятро Бітэль). Нечакана выяўленая стрыечная сястра Ядзя сказала Яцэку, што побач з Гданьскам жыве ў Польшчы яшчэ адзін яго стрыечны дзядзька. І здзіўлены госць паабяцаў яго наведаць пасля вяртання.

У Астравец мы вярнуліся апоўначы. Вячэралі хутка, амаль без размоў. Не ведаю, ці спаў Яцэк у тую ноч. Але раніцай ён з'явіўся перад намі зноў у першасным выглядзе — галантны, далікатны, ураўнаважаны. А перад самым развітаннем купіў мне і Алене Глагоўскай горку шакаладных цукерак і сказаў: "Дзякуй вам, дзяўчаты, за ўсё". Сказаў ціха-ціха, амаль аднымі вуснамі. Але мы пачулі і зразумелі: няпроста знаходзіць уласныя карані, калі табе ўжо 44 гады.

Тэкст і фота **Ганны ЧАКУР**,
супрацоўніцы газеты
"Астравецкая праўда".

Асоба

Этнамузыказнаўца Зінаіда Мажэйка

Пачатак на 5-й стар.

фалькларыстыкі Рыгора Шырмы і Генадзя Цітовіча. Яна адрадзіла раскіданыя па розных рэдкіх выданнях класічныя даследаванні фальклору і зборы песень Зінаіды Эвалд і разам са сваімі вучнямі, вядомымі сёння фалькларыстамі, выдала першую гісторыю беларускай музыкалогіі ("Беларуская этнамузыкалогія". Мн., 1997). Яна стала пачынальнікам беларускай практычнай фалькларыстыкі, накіраванай на адраджэнне і ўвядзенне ў кантэкст сучаснай мастацкай культуры шэдэўраў народнай творчасці. Сярод яе творчых дасягненняў — стварэнне этнамузычных дакументальных фільмаў "Палескія калядкі" (1972, рэжысёр Н.Сава), "Галасы вякоў" (1979, рэжысёр Н.Сава), "Памяць стагоддзяў" (1982, рэжысёр Н.Сава), "Палескія вяселлі" (1986, рэжысёр Ю.Лысятаў), "Пранясі, Божа, хмару" (1990, рэжысёр А.Шклярэўскі), "Крывыя вечары" (1993, рэжысёр Ю.Лысятаў), "Рух зямлі" (1999, рэжысёр С.Гайдук).

Ужо сорак гадоў З.Мажэйка і яе вучні прэзентуюць беларускі фальклор, аўтэнтычную культуру народа ў славянскім свеце, Еўропе і Амерыцы. Яна — актыўны дзеяч Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, выбіралася ў кіраўнічыя органы гэтага грамадскага аб'яднання.

Сёння, вітаючы Зінаіду Мажэйку з 40-годдзем навуковай дзейнасці, мы захапляемся яе творчай энергіяй.

НА ЗДЫМКУ: З.МАЖЭЙКА (першая злева) у кінаэкспедыцыі на здымках дакументальнага фільма "Палескія вяселлі" (з архіва фалькларысткі).

Уладзімір КОНАН,
доктар філасофскіх навук,
сябар камітэта ГА "МАБ".

Хроніка падзей

Нас наведалі...

...***Юрый Лабынцаў***, загадчык Цэнтра беларусазнаўчых даследаванняў Інстытута славяназнаўства Расійскай акадэміі навук, і сакратар таго ж цэнтра **Ларыса Шчавінская**. Гаворка ішла аб актывізацыі дзейнасці маскоўскіх беларусістаў у час падрыхтоўкі да IV Міжнароднага кангрэса беларусістаў, іх падпісцы на "Голас Радзімы".

... ***Андрэй Котлярчук***, даследчык Школы балтыйскіх і ўсходнееўрапейскіх даследаванняў Універсітэта Паўднёвага Стакгольма. Ён паведаміў, што цяпер працуе над тэмай "Вялікае княства Літоўскае і шведы", вывучае адну шведскую вёску ва Украіне, дзе захаваліся архаічная мова і звычаі. У сувязі з гэтым згадалася, што аналагічную беларускую вёску каля Днепрапятроўска даследуе беларусіст Мікола[illegible]бан. А. Котлярчуку быў дадзены яго адрас. Гаварылася таксама пра ўдзел шведскіх беларусістаў у чарговым кангрэсе, магчымым месцы правядзення "круглага стала", прысвечанага спадчыне ВКЛ, пад патранатам Шведскага інстытута.

З надасланага

"Мая Радзіма"

Выйшаў спецыяльны выпуск газеты новасібірскай гарадской грамадскай арганізацыі "Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр у імя святой Ефрасінні Полацкай", прысвечаны 110-й гадавіне горада Новасібірска і 80-годдзю Новасібірскай епархіі, святкаванню памяці святой прападобнай Ефрасінні Полацкай.

Адкрываецца нумар зваротам да чытачоў старшыні праўлення цэнтра І.Панасюка. З артыкулам "Беларусы ў Сібіры: Дарога без канца" выступае аўтар з Мінска, галоўны рэдактар часопіса "Крыніца. Славянскі свет" М.Бушэнка. Пра дзейнасць беларускага культурна-асветніцкага цэнтра расказвае яго дырэктар А.Лагуценка. Называюцца імёны беларусаў, заслужаных для Сібіры: прафесараў Валерыя Петухова і Івана Дабралюбава, заслужанай настаўніцы Расіі Любові Смірновай, вайскоўцаў Мікалая Роўды і Уладзіміра Буракова, навукоўца Альберта Мітэра.

Л.Смірнова змясціла ў нумары беларускамоўны артыкул "Кахаю я Слуцк. Прыгожы ён, а будзе яшчэ лепшы". Апошняя старонка адведзена "Сакрэтам беларускай кухні". Тыраж выдання 999 экземпляраў.

Новыя выданні

***

ЖЕНЩИНЫ НА КРАЮ ЕВРОПЫ / Под ред. Елены Гаповой. Мн., 2003.

У калектыўнай манаграфіі, падрыхтаванай Цэнтрам гендэрных даследаванняў Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, разглядаецца становішча жанчын у Беларусі ў мінулым і сучаснасці. "Прэзентуюцца" творы мастачак.

***

Міхневіч А.Я. ***ЯКУБ КОЛАС РАЗВАЖАЕ, РАДЗІЦЬ, СМЯЕЦЦА...***: Выбраныя выслоўі народнага песняра. Мн., 2002.

Выданне прысвечана 120-годдзю з дня нараджэння беларускага песняра.

***

Рагойша В.П. ***НА ШЛЯХУ ДА ПАРНАСА: ДАВЕДНІК МАЛАДОГА ЛІТАРАТАРА.*** Мн., 2003.

Адзін з пачынальнікаў нашай асацыяцыі напісаў настольную кнігу як літаратара, так і чытача.

***

Стасевіч Я.Д. ***ХТО ТЫ, ВЯДЗЬМАК-ЛЫСАГОРСКІ?*** З гісторыі пошукаў аўтара паэмы "Сказ пра Лысую гару". Мн., 2003.

Аўтар, эканаміст па прафесіі, былы остарбайтэр у Германіі, адным з першых абгрунтаваў думку, што аўтарам паэмы з'яўляецца Ніл Гілевіч ("Голас Радзімы" пісаў пра гэтае аўтарства).

***

Штэйнер Іван. ***DEJA VU, АБО УСПАМІН ПРА БУДУЧЫНЮ***. Мн., 2003.

Чарговая кніга гомельскага прафесара. Параўнальная праблематыка ўзнімаецца ў ёй у даследаваннях "Баладныя пошукі Радзімы: "Смаленскі цыкл" Я.Купалы і баладыстыка Г.Траянава і М.Крлежы" (с. 3-31), "Л.Талстой і А.Адамовіч: урокі жыцця і творчасці" (с. 55-64).

***

BELARUSIAN AND BELARUS-RELATED PUBLISHING IN THE WEST: MONOGRAPHIC PUBLICATIONS: BIBLIOGRAPHY. Compild Zora and Vitaut Kipel. New York, Miensk, 2003.

Чарговае выданне (№ 6) Бібліяграфічнай серыі Беларускага інстытута мастацтва і навукі, прысвечанае беларускім і беларусазнаўчым выданням на Захадзе.

Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.

З рэдакцыйнай пошты

У Данецку выйдзе зборнік пра Ельскіх

Як нашчадку славутага беларускага роду Ельскіх, мне прыемна паведаміць вам, што энергічныя, настойлівыя і пераканальныя візіты прэзідэнта Таварыства польскай культуры Данбаса пана Рышарда Зялінскага ў Польшчу завяршыліся поспехам.

Гэтае таварыства атрымала ад "Вспульноты Польскей" фінансаванне на тое, каб выдаць кнігу, прысвечаную 500-годдзю роду Ельскіх, з якога, прыгадаю, выйшлі беларускі пісьменнік Аляксандр Ельскі (на яго юбілеі ў Мінску я меў гонар прысутнічаць), скрыпач і кампазітар Міхал Ельскі (яго імя цяпер носіць Міжнародны конкурс інструменталістаў у Мінску), заолаг і падарожнік, мой прамы продак Канстанцін Ельскі.

Паколькі часу застаецца мала (рукапіс павінен быць здадзены ў студзені 2004 года), прашу тых беларусістаў, у каго ёсць што сказаць пра Ельскіх, тэрмінова, да канца бягучага года, прыслаць артыкулы ў раздрукаваным і электронным выглядзе па адрасу:

Рышард Зялінскі, Таварыства польскай культуры Данбаса, вул. Арцёма, 97, пакой 312, Данецк, 83000, Украіна.

Памер артыкулаў да 10-15 старонак. Праца павінна быць набрана ў тэкставым рэдактары Word 95 і вышэй. Шрыфт Times New Romano, памер 12 праз паўтара інтэрвала. Абавязкова прыкладзіце дыскету ў тым жа фармаце.

Віншую вас з Новым годам, жадаю творчага натхнення і плённай работы. З нецярплівасцю чакаю цікавых артыкулаў ад усіх даследчыкаў роду Ельскіх, якія ў XIX стагоддзі гняздзіліся ў Дудзічах (цяпер Дудуткі) і Замосці былога Ігуменскага павета Мінскай губерні.

Віктар ЕЛЬСКІ,
прафесар, член-карэспандэнт
Акадэміі медыцынскіх навук
Украіны.

госць

КРОКІ АДЭСКАЙ "БЕЛАРУСІ..."

У гэтым годзе дэлегацыя, у складзе якой былі і прадстаўнікі нашай рэдакцыі, выязджала на святкаванне Дня славянскага пісьменства і культуры ў Адэсу (мы аб гэтым падрабязна пісалі), дзе і правяла сустрэчы з нашымі суайчыннікамі. І вось нядаўна з Адэсы прыехаў у Беларусь старшыня гарадскога нацыянальна-культурнага аб'яднання грамадзян "Беларусь" Фёдар КАВАЛЕВІЧ, з якім і адбылася наша размова.

— Патлумачце, калі ласка, пра мэту вашага візіту.

— Мы, адэскія беларусы, марым у Адэсе пра стварэнне Беларускага гандлёвага дома, у якім былі б шырока прадстаўлены вырабы беларускіх вытворцаў. Беларускія тавары добра ведаюць у Адэсе, і яны карыстаюцца вялікім попытам, але, на жаль, трапляюць на рынак дзякуючы гандлярам-"чаўночнікам" (так называюць прадпрымальных людзей, якія возяць тавар невялікімі партыямі). Цікавасць да стварэння такога гандлёвага прадпрыемства праявілі не толькі адэскія беларусы, а і дзяржаўныя ўстановы, у прыватнасці, мэрыя Адэсы, ды і беларускі бок зацікаўлены ў новых рынках.

Са мной прыехала група прадпрымальнікаў, сярод якіх ёсць і беларусы, і ўкраінец. Ужо правялі перагаворы з кіраўніцтвам Гомельскай адміністрацыі і знайшлі поўнае разуменне. Сустракаліся ў Мінску з намеснікам дырэктара МАЗа па маркетынгу, дзе і вырашалі пытанне пра стварэнне сумеснага прадпрыемства. Тут мы даведаліся, што ў Кіеве ўжо ёсць афіцыйны дылер гэтага завода, так што прасцей будзе наладжваць яго дзейнасць. Шмат пытанняў вырашаецца ў Брэсце.

— Якія тавары ці вырабы цікавяць прадпрымальнікаў?

— У першую чаргу мы зацікаўлены ў пастаўках у Адэсу апаратуры бытавога прызначэння (газавыя пліты), будаўнічых матэрыялаў, мэблі, трыкатажу, прадукцыі электралямпавага завода і пральных машын Баранавіцкага завода, якія не саступаюць па якасці нямецкім.

Акрамя таго, у нас ёсць сустрэчныя прапановы. Мы даводзім да ведама кіраўнікоў беларускіх прадпрыемстваў, што ёсць магчымасць арганізаваць адпачынак работнікаў прадпрыемстваў на марскім узбярэжжы на базах адпачынку, у санаторыях. З улікам новага ўкраінскага заканадаўства з'явіліся прапановы аб выкупе зямлі ў левапрыбярэжнай зоне на касе Шыбалаўскага лімана. Дамаўляемся аб пастаўцы ў Беларусь сельгаспрадукцыі.

Спадзяёмся, што арганізацыя Беларускага гандлёвага дома дазволіць вырашыць многія пытані нашым землякам, у тым ліку і фінансавыя.

— Фёдар Паўлавіч, вы наведалі Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Аб чым ішла гаворка?

— Нас хвалюе адсутнасць нацыянальных касцюмаў у нашых самадзейных артыстаў. З-за гэтага мы не можам шырока прадстаўляць нашу дыяспару на гарадскіх мерапрыемствах. І вельмі добра, што мы знайшлі разуменне ў камітэце, дзе нам паабяцалі, што ў наступным годзе касцюмы ў нас будуць.

— Ужо снежань, не за гарамі сустрэча Новага года. Як яго збіраецеся святкаваць — у коле сям'і ці разам з землякамі?

— Летась мы ўсёй суполкай святкавалі ў памяшканні, якое нам выдзелілі, але цяпер яно ў стадыі рамонту, таму наш паважаны зямляк Сяргей Пратасеня запрасіў актывістаў абшчыны да сябе ў вялікі ўтульны дом, які ён сам пабудаваў. Мы ўжо падрыхтавалі сцэнарый свята.

Дарэчы, гэты год быў плённым для нашай дыяспары. Шмат было розных мерапрыемстваў. І сярод запамінальных — Дзень Рэспублікі Беларусь і Дзень славянскага пісьменства і культуры з удзелам "Голасу Радзімы". Трэба сказаць, што прыезд дэлегацыі, які арганізавала ваша газета, і даў штуршок для перагавораў з мэрыяй аб супрацоўніцтве. Новы аўтобус МАЗа, на якім прыехала ваша дэлегацыя, спадабаўся адэскім уладам, і яны збіраюцца закупіць такія аўтобусы.

І яшчэ ў гэтым годзе Адэскае тэлебачанне паказала 30-хвілінны відэафільм, які зняла тэлекампанія "РІАК". Ён расказвае пра наша аб'яднанне, якое ўжо тры гады вядзе культурна-асветніцкую дзейнасць у горадзе. Фільм пра лёсы беларусаў, што па розных прычынах аселі ў Адэсе, якая стала для іх другім домам, але захавалі памяць і любоў да зямлі продкаў. Гэты фільм стаў сапраўднай падзеяй, атрымаў шмат водгукаў і неаднойчы на працягу года паўтараўся па тэлебачанні.

— Што б вы хацелі пажадаць напярэдадні свята нашым чытачам?

— Перш за ўсё хачу пажадаць роднай Беларусі, каб яна квітнела, мацнела, каб заўсёды памятала пра нас, тых беларусаў, якія жывуць за яе межамі і ніколі яе не забываюць.

Дзякуй за газету. Мы яе чытаем і перадаём у іншыя раёны.

НА ЗДЫМКУ: у гасцінным доме Сяргея ПРАТАСЕНІ (у цэнтры) сабраліся актывісты абшчыны.

Гутарыла **Таццяна КУВАРЫНА.**

коратка

СЯБРЫ Ў АРГЕНЦІНЕ

У парламенце Аргенціны з'явіцца дэпутацкая група сяброў Беларусі.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі Вадзім Лазерка сустрэўся з дэпутатамі аргенцінскага парламента, якія выказалі гатоўнасць садзейнічаць стварэнню групы.

АДКРЫТА КОНСУЛЬСТВА

У Бялай Падлясцы (Польшча) адбылося афіцыйнае адкрыццё Консульства Рэспублікі Беларусь.

ЭТНІЧНЫЯ БЕЛАРУСЫ НА ДЗЕВЯТЫМ МЕСЦЫ

Этнічныя беларусы, якія пражываюць у Расіі, па колькасці займаюць дзевятае месца сярод прадстаўнікоў 160 нацыянальнасцей. З 145,2 мільёна жыхароў Расіі беларусы складаюць 814,7 тысячы, або 2,9 працэнта.

Такія даныя Усерасійскага перапісу насельніцтва 2002 года, вынікі якога абнародаваны цяпер.

Найбольш кампактна беларусы пражываюць у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Карэліі, Краснадарскім краі, Калінінградскай вобласці і шэрагу іншых рэгіёнаў. У больш як 60 суб'ектах Федэрацыі створаны рэгіянальныя арганізацыі беларусаў, аб'яднаныя ў Федэральную нацыянальна-культурную аўтаномію "Беларусы Расіі".

Згодна з вынікамі перапісу, у Расіі рускія складаюць 80 працэнтаў ад насельніцтва краіны, на другім месцы — татары, на трэцім — украінцы.

Эдуард ПІВАВАР, БелТА.

з пошты яўгена лецкі

Нядаўна з Варшавы прыйшоў ліст ад вядомага ў Польшчы навукоўца, аднаго з самых аўтарытэтных беларусістаў у свеце Базыля Белаказовіча, у якім ён дзякуе мне за змястоўныя нататкі пра яго працы "Адданасць славянству" ("Голас Радзімы", 21 жніўня 2002 года, № 34). Вядома, прыемна, і, як у нас кажуць, дзякуй за дзякуй. А таксама за дасланыя дзве вельмі грунтоўныя і цікавыя працы "Адам Міцкевіч у беларускай паэзіі" і "Польска-беларускія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі"), якія патрабуюць уважлівага асэнсавання і грунтоўнай ацэнкі. А яшчэ ў пакеце быў нумар польскай газеты "Wspólnota" з артыкулам, на які паважаны пан прафесар звяртаў маю ўвагу. Я яго, зразумела, прачытаў. Мне падаўся цікавым погляд на сённяшнюю Беларусь збоку, хоць не з усім я тут згодны. Але кожны чалавек мае права на сваю думку. А вось пафас ідэі яднання славянства, выказаны аўтарамі нататак, мне вельмі блізкі, бо перакананы: толькі на ўдумлівым асэнсаванні ўласнай нацыянальнай духоўнай спадчыны, дбайнага стаўлення да культуры, у тым ліку і мовы, сваіх славянскіх народаў мы здолеем крочыць у шчаслівую будучыню, адчуваць сябе гаспадарамі, а не парабкамі на роднай зямлі. Прапаноўваю ў сваім перакладзе матэрыял пра летнюю сустрэчу моладзі братніх славянскіх народаў.

Яўген ЛЕЦКА.

XXX СУСТРЭЧА СЛАВЯНСКАЙ МОЛАДЗІ

Польскі славянскі камітэт чарговы раз быў запрошаны ў лагер славянскай моладзі "Дружба-2003". Гэтая сустрэча павінна паспрыяць наладжванню стасункаў і супрацоўніцтва паміж славянскімі народамі. А ў нашым выпадку гэта найлепшая нагода пазбыцца нейкіх стэрэатыпаў у дачыненні да нашых усходніх суседзяў.

У прыгожы бярозавы гай, дзе на памежжы Беларусі, Украіны і Расіі стаіць вялікі манумент Дружбы, з'ехалася моладзь з Прыднястроўя —асобай часткі Малдовы, з Польшчы, Чэхіі і, натуральна, з трох краін-суседак: Беларусі, Расіі і Украіны.

На працягу трох дзён амаль паўтары тысячы чалавек, прадстаўнікі розных славянскіх народаў, жылі побач, супольнічалі, працавалі і адпачывалі, глядзелі выступленні сяброў, спаборнічалі ў спартыўных гульнях. І ўсё дзеля таго, каб як найшырэй і найлепш распазнаць адзін аднаго. Такім чынам, нібы незнарок, падчас штодзённых заняткаў, адбываўся абмен культурнымі здабыткамі, вопытам, ведамі.

Не бракавала таксама сустрэч у абсягах палітычных. Нам пашанцавала размаўляць з людзьмі з блізкага акружэння Прэзідэнта Лукашэнкі, з уладамі гомельскага рэгіёна, Беларускага саюза моладзі, а таксама архівістамі і гісторыкамі.

Лагеры дружбы — гэта найперш вялікія фестывалі маладзёжных артыстычных гуртоў. Сярод іх пераважаюць традыцыйныя калектывы народнага накірунку. Цікава, што славянская моладзь умее выдатна бавіць час пры бацькоўскіх песнях. На дыскатэках заходняя музыка — з'ява рэдкая. Не таму, што цяжкадаступная — на свае вочы пераканаліся, што ў крамах можна набыць дыскі розных заходніх гуртоў. Проста моладзь жадае слухаць сваю музыку, якая найлепш адпавядае іх славянскай душы. Мусім гэта ацаніць станоўча, бо маладыя маюць рацыю! У рускіх і беларусаў ёсць цяпер вельмі добрая забаўляльная музыка, што абапіраецца на ўласныя музычныя традыцыі, на народную песню. Дзякуючы гэтаму, іх нацыянальная культура — з'ява заўсёды жывая і мае шанс быць запатрабаванай наступнымі пакаленнямі.

Калі былі на чарговым канцэрце, то заўсёды пыталіся: "А дзе ж польскія гурты?" Сапраўды, з жалем трэба сказаць, што польскіх калектываў не хапала. А таму на наступны год арганізатары вельмі спадзяюцца на прыезд палякаў са сваёй музыкай, танцамі і песнямі.

Тут мы сутыкнуліся з вострай праблемай, што датычыць стаўлення Польшчы і палякаў да ўсходняга славянства. Адчулі мы з таго боку велізарную цікавасць і сімпатыю да нас і нашай краіны, але таксама прысмак смутку, што так рэдка супольнічаем. Цікава, што яны не забываюць нават пра лужыцкіх сербаў. А хто ў Польшчы памятае пра той братні, пад уціскам народ?

Са шматлікіх размоў вынікае, што Польшча на Усходзе ўяўляецца капіталістычнай краінай з высока развітай эканомікай, што забяспечвае людзям працу і годнае жыццё. Адкуль гэта вядома? Ці ж не таксама ў васьмідзесятых гадах мінулага стагоддзя нам уяўляўся Захад? Калі мы казалі пра 40 працэнтаў беспрацоўных, нястачу грошай, прыватызаваныя, але зачыненыя фабрыкі, занядбаныя, толькі прыкрытыя дэкарацыямі з каляровых плакатаў будынкі, нам не хацелі верыць. А таму мы запрашалі: "То прыязджайце да нас, пакажам вам сапраўдную Польшчу".

Махавік глабалістычнай прапаганды дзейнічае ў абодва бакі. І надалей нам звініць у вушах лозунг еўрапеістаў: "Калі не Еўрасаюз, то Беларусь?" Трактаваў ён Беларусь, якая выбрала ўласны шлях развіцця, краем нэндзы, тэрору і адсутнасцю перспектывы. Але мы праехалі цягніком усю Беларусь з Брэста праз Мінск да Гомеля. Напэўна, пабачылі толькі частку гэтай вялікай дзяржавы. Але тое, што ўбачылі, зусім не адпавядае прапагандысцкім лозунгам.

Напрыклад, галоўны чыгуначны вакзал у Мінску, збудаваны ў апошнія два гады, — прасторны, сучасны, паглядны, з рухомымі сходамі, камп'ютэрызаваны, з чыстымі туалетамі. Ён нават і блізка не падобны да бруднага, абшарпанага, шэрага цэнтральнага вакзала ў Варшаве, сталіцы дзяржавы, што так імкнецца ў Еўропу, у якой, дарэчы, яна заўсёды была. Інвестыцыі ў інфраструктуры горада тут непараўнальна большыя, чым у Польшчы: замена плітак на ходніках, упарадкаванне вуліц, рамонт будынкаў і помнікаў. Прапанаваў бы прайсціся па вуліцах Пазнанскай, Хмельнай (з боку Волі) ці Жалезнай у Варшаве, каб пераканацца, як нам далёка да той "беднай" Беларусі! Стан чыгункі і якасць абслугі ў цягніках вымагае асобнай гаворкі, але параўнанне зноўку не на нашу карысць. Трэба зазначыць, што чыгуначны транспарт у Беларусі дзяржаўны. І яшчэ адно хачу дабавіць: усюды чысціня.

Уражвае сучаснага паляка шчырасць тутэйшых людзей. Мелі мы нагоду супольнічаць з беларусамі, для якіх кантакт з іншым чалавекам — вартасць самадастатковая. Там не страцілі здольнасці размаўляць. Надалей гэта адна з найважнейшых рэчаў у жыцці, прынамсі, не дзеля матэрыяльнай карысці, не для бізнесу, а проста дзеля прыемнасці быць разам. Паказальна, што будучы тры дні ў асяроддзі, па сутнасці, чужых людзей, сустракаючыся ў розных групах, ніводнага разу не бачыў нейкай канфліктнай сітуацыі ці пагроз. Тым больш, увогуле не заўважалі мы прыкмет агрэсіўнасці паміж імі! На жаль, пра польскія маладзёжныя імпрэзы такога не скажаш.

Вярнуліся мы ў Польшчу перакананымі, што наш дом — Еўропа славян. Наша ніва дзейнасці, працы, жыцця — славяншчына. Бо яна найбольш адпавядае нашай ментальнасці і характару. З Заходняй Еўропай мы ніколі не знойдзем такога глыбокага рознабаковага паразумення, як са славянамі.

Перад Польскім славянскім камітэтам, такім чынам, стаіць велізарнай важнасці заданне: захаваць і ўмацаваць повязі са славянскімі народамі. Гэта асабліва істотна з увагі на экспансію глабалізму на Сярэднюю Еўропу, а ў далейшай перспектыве і Усходнюю, што ўжо выявілася ва ўцягванні Польшчы ў Еўрасаюз. Мусім растлумачваць нашым братнім славянскім народам пагрозу, што насоўваецца на нашу культуру і самаіснасць з Захаду. Хоць, гледзячы на сучасных украінцаў, беларусаў ці рускіх, маем уражанне, што яны ўжо сябе трывала абаранілі. А мы ж выступаем у ролі "павы і папугая народаў", як пісаў Юліуш Славацкі...

Жувія ЦЕСЛЯК, Зянові ЦЕСЛЯК, Тадэвуш СІКОРСКІ,

удзельнікі сустрэчы.

дэбют

ВАРАТЫНСКІЯ КАЗКІ

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

Палескімі сцяжынамі даехаў я да Варатына, дзе жыве, стварае (а часам і творыць) казачніца і проста харошы чалавек Ірына Шпакоўская. Іра запрасіла мяне пагасцяваць, на што я ахвотна згадзіўся. Варатын – вялікая вёска за 45 кіламетраў ад Калінкавічаў. Калінкавічы – буйны чыгуначны вузел з новым, шыкоўным вакзалам – амаль як у Вільні. А вось да Варатына не дабрацца: аўтобус ходзіць два разы на тыдзень. Добра, што Іра з татам сустракалі мяне ля цягніка.

У Варатыне жыве каля тысячы чалавек. Ёсць там і клуб, і школа, і крамы. Нават фантан, які ўключаюць па святах. Іра жыве ў дружнай сям'і – з сястрой-блізняткай Марынай, старэйшай сястрой Таняй ды бацькамі. Усе дзеці ў сям'і – на радасць бацькам: і вучацца выдатна, і на алімпіядах абласных месцы прызавыя займаюць. Старэйшая Таня цяпер вучыцца ў сталіцы на медработніка, Іра з Марынай перайшлі ў 11 клас.

Вёску атачае лес. Дзіўна ціхі – ні кузуркі. Адно яшчаркі носяцца пад нагамі. Падумалася: мо, радыяцыя. Сапраўды, Варатын на мапе пазначаны забруджанай плямай. Адсюль штогод адпраўляюць дзяцей на аздараўленне ў Італію. Ездзілі і Шпакоўскія.

Хадзіў я па лесе, думаючы, ці я свежым паветрам дыхаю, ці радыяцыю ўсмоктваю – і дайшоў да могілак. Ага – сярэдні ўзрост на помнічках – гадоў 40. То адзін ад раку памёр, то другі...

І як здзек успрымаеш тое, што зямля тут урадлівая. Гэтым годам добрымі былі агурочкі, памідорчыкі, капуста. Вішань поўна было. У той час, як у мяне, на Случчыне, мо з паўлітра вішань з усіх дрэў і сабралі. Хадзілі мы з Ірай купацца на раку Трэмлю. Да яе вядуць абшары балот. Тут калгас спрабаваў пасадзіць буракі, ды нічога не атрымалася. Былі розныя меліярацыі, ды, як вядома, прывялі яны адно да знішчэння часам унікальных відаў жывёл і птушак.

Непасрэдна ў Варатыне рабіў я пераклады Ірыніных твораў з рускай мовы – аўтарызаваныя, так бы мовіць. Нешта з гэтага прапаноўваю і вам, шаноўныя чытачы.

Ірына ШПАКОЎСКАЯ

КАЦЯНЯ Й ФАТЭЛЬ

Маленькая котачка — яшчэ зусім кацяня — спрытна ўскочыла на фатэль.

"Якая прастора!" — падумалася котачцы, і яна агледзелася навокал. Але проста спакойна сядзець было сумна. "Які ў мяне хвасточак, — з гонарам меркавала котачка. — Ніхто не мае гэткага харошанькага пухнастага хвасточка! А як ён цікава варушыцца!" Кацяня асцярожна памацала пэндзлік свайго хваста. Яно нават трохі пасунулася, каб лепш пабачыць свой скарб. Але вось халера — хвасточак раптам адсунуўся! Кацяня зноў наблізілася да яго, але той, пэўна, не жадаў спакойна ляжаць ва ўсім сваім харастве. Скок! Котачцы не хапіла нейкай пары сантыметраў, каб ухапіцца за хвост. Скок! Зноўку міма! І тут пачалося... Скок! Скок! У іншы бок! Скок-паскок! Зноўку скок! І яшчэ раз! І яшчэ!..

"Гляньце вы, расхадзілася! — хмурна падумалася фатэлю. — Скача, як конь. А я ж не маладзён, каб трываць такое!"

А кацяня ўжо ляжала на баку і старанна вылізвала злоўлены нарэшце хвасточак. "Вось так, вось так! — думала яно і працавала языком. — Ты ў мяне будзеш хораша блішчэць. Будзеш прыгожанькім, пухкім, чыстым хвасточкам. Ажур!" Хутка кацяня згадала, што даўно не чысціла ды не падточвала сваіх кіпцяў. Раз! Ружовенькія кіпцікі ўпіліся ў тканіну фатэля. "Ён усё адно стары. Не страшна, калі я трохі...— меркавала котачка, перабіраючы лапкамі. — А кіпці варта чысціць хаця б раз на тры дні!"

"Вось дзе ўжо нахабніца! — абурана падумаў фатэль. — Усе яны такія! Мая воля, дык я б ім усім... Вох! Цярпець іх не магу! Яны ўсе толькі пра тое і мараць, каб папсаваць чужую абіўку. Нягоднікі!"

А кацяня зноўку кінулася ў пагоню за сваім хвасточкам. Але хутка стамілася і легла, звярнуўшыся абаранкам. Проста ляжаць было, вядома, нецікава, і котачка ўзялася марыць: "Вось вырасту, — думала яна, — буду найлепшай у свеце паляўнічай. Штодзень буду лавіць па мышы. Не, лепш па дзве! За гэта гаспадыня будзе частаваць мяне малачком. Не, смятанай. Ды рыбкай. Яна мяне будзе любіць. І будзе рабіць усё, што я захачу. Мабыць. Ну ды няхай. А калі я зраблюся старой... Не-е, я ніколі не састарэю",— падумала кацяня, пазяхнула і тут жа прыснула.

"Спіць, — падумаў фатэль, падазрона паглядзеўшы на котку. — А што ёй — ніякіх жа клопатаў. Вось калі я быў маладзейшым... У мяне тады была цудоўная абіўка! Дык вось, я быў нашмат лепшым, выхаванейшым і... і ўвогуле! У маладосці я быў гэткім, гэткім... Ну, у мяне ж была новая абіўка... Добрая тады была пара, не тое, што цяпер. А я тады быў... Ну, добрым я быў. Нашмат лепшым за сённяшнюю моладзь. Эх!"

Кацяняці мірна спалася ў фатэлі, і збоку здавалася, што паміж імі існуе поўная згода і паразуменне...

P.S. Міражы мы таксама часам прымаем за рэальнасць...

Малюнкі Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

СКРЫПАЧКА

Яна сядзела на крэсле — худзенькая, яснавокая, у недарэчным сінім балахоне — і трымала на каленах скрыпку. Шафа, куды хавалі пасля заняткаў дапаможныя інструменты, была адчынена, на адной з яе паліц валялася анучка. Яна не бачыла, як я ўвайшла, мабыць, яна ўвогуле нічога не бачыла. Яе танюткія пальцы асцярожна гладзілі скрыпку, часам закранаючы струны.

— Умееце іграць? — ветліва пацікавілася я.

Яна ўскочыла і перапужана паглядзела на мяне. Ад яе спакойнага, задуменнага выразу твару нічога не засталося — толькі страх і збянтэжанасць.

— Умееце іграць? — паўтарыла я, каб парушыць няёмкае маўчанне.

— Не, — адказала яна ціха.

— Але ж я бачыла, як вы перабіралі струны, — спакойна запярэчыла я. — Згадвалі мелодыю?

— Ах, тое... — стомлена сказала жанчына. Яна крыху памаўчала ды нечакана ўзяла смык. Яе твар дзіўна пераўтварыўся — нібы разгладзіліся зморшчыны, пабляклыя вочы, здаецца, загарэліся яркім агнём, а вусны кранула ледзь улоўная ўсмешка. Скрыпка заплакала ў яе руках, застагнала сотнямі жаласных галасоў. Я стаяла і адчувала, як недзе ўнутры пачынае дрыжаць тонкая струна. Чуллівае вуха музычнага выкладчыка фіксавала фальшывыя ноты, але незнаёмая мелодыя зачароўвала, нягледзячы ні на што...

Яна раптам скончыла ігру. Я сцепанулася:

— Гэта вы склалі?

Жанчына маўчала, але я і так усё зразумела.

— У вас талент, вам трэба вучыцца... — пачала я.

Яна паглядзела на мяне злоснымі вачыма і адвярнулася.

— Вы ведаеце, колькі мне гадоў? — запыталася рэзка.

— Не ведаю, — шчыра сказала я. — Думаю, вы трохі старэйшая за мяне.

— Я *нашмат* старэйшая за вас, — сумна ўсміхнулася жанчына.

— Гэта нічога не азначае!

— Гэта азначае ўсё, — перабіла яна мяне. — Я занадта старая, каб вучыцца сур'ёзна. І вы павінны гэта цудоўна разумець.

Яна паклала скрыпку ў шафу і ўзяла швабру, паказваючы гэтым, што размова скончана. Я глядзела на яе худыя запясці ды ненатуральна вялікую ў параўнанні з імі брудную анучу.

— Чаму вы не вучыліся ў маленстве? Вы цяпер, магчыма, былі б на сусветнай сцэне...

Яна павольна разагнулася ды насмешліва паглядзела на мяне:

— Мой бацька быў звычайным рабочым на заводзе, а мама рабіла санітаркай у шпіталі. У музычнай школе на мяне нават не зірнулі.

— Хто ж тады навучыў вас іграць?

Жанчына зморшчылася:

— Да адной з маіх аднакласніц настаўнік музыкі хадзіў на дом — яе бацькі маглі дазволіць сабе гэта. Мне ж можна было назіраць за тымі ўрокамі, стоячы за гардзінай. Наўзамен я іграла на скрыпцы, калі сяброўка ішла гуляць з таварышкамі на двор, і яе бацькі лічылі, што дачка займаецца музыкай. Але аднойчы нам гэта не збегла з вадой, і яна добра атрымала за дружбу са мной. Хаця хіба тое была дружба? Пасля таго выпадку яна ні разу не паглядзела ў мой бок...

— Але скажыце...

— Навошта?

— Даруйце?.. — не зразумела я.

— Навошта трывожыць амаль загоеную рану?! — стомлена сказала яна. — Нічога ж не зменіш. Ёсць у мяне талент, няма ў мяне таленту — якая цяпер розніца?

— Але...

Яна выбегла з аўдыторыі, пакінуўшы вядро і швабру стаяць ля дзвярэй. Яна ведала, што заўсёды можа вярнуцца сюды і дарабіць сваю справу. Дамыць недамытую падлогу, выцерці пыл і паліць кветкі.

Дзеці нашмат хутчэй за дарослых засвойваюць новыя веды, але нават у іх на тое, каб навучыцца добра іграць на скрыпцы, ідуць гады.

Я ўспомніла, як яна іграла. Тое была не музыка, не... Гэта быў ціхі енк пакрыўджанай душы скрыпачкі ад Бога...

Прыбіральшчыца... Неагранены бясформенны дыямент.

факт

ПАДТРЫМКА ТАЛЕНТАЎ

Раяль фірмы "Ямаха" коштам 80 мільёнаў рублёў быў набыты на грошы Спецыяльнага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі для Магілёўскага музычнага вучылішча імя Рымскага-Корсакава.

Фота Белта.

Цырымонію перадачы інструмента музычнаму вучылішчу правяла старшыня савета Спецыяльнага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Наталля Аўдзеева. Яна ўручыла 6 вучэбнага музычнага вучылішча пасведчанні стыпендыятаў Прэзідэнцкага фонду. Урачыстая цырымонія завяршылася канцэртам навучэнцаў.

НА ЗДЫМКУ: стыпендыят Тацяна САБАЛЕЎСКАЯ.

напярэдадні

МАСТАЦТВА ДАКУМЕНТАЛІЗМУ...

Пачатак на 4-й стар.

Спадзяемся таксама прыцягнуць крытыкаў, якія пішуць пра мастацтва фатаграфіі. Тое, што ствараюць нашы майстры, вартае іх сур'ёзнага разгляду.

– Са з'яўленнем вашай арганізацыі павінна ажывіцца фатаграфічнае жыццё ў краіне?

— Яно ўжо ажывілася. Напярэдадні з'езда фатографаў прайшло некалькі выстаў у сталічнай галерэі "Нова", дзе да фатаграфіі ставяцца паважліва і цэняць яе як мастацтва. У гандлёва-выставачным комплексе "Манеж" зараз праходзіць ужо 4-я наша экспазіцыя. Была фотавыстава і ў галерэі Г.Вашчанкі ў Гомелі.

Вельмі важным у сваёй дзейнасці мы лічым захаванне творчай спадчыны фатографаў, з чым зараз шмат праблем: ніхто сур'ёзна не займаецца гэтым пытаннем. Адыходзяць у нябыт людзі, а з імі і тое, што яны стварылі. Хацелася б змяніць такую сітуацыю. Да з'езда мы правядзём выставу работ фатографаў, якіх ужо з намі няма. Нейкія іх працы знайшлі ў фотаклубе "Мінск", нешта — у прыватных калекцыях.

Пералічаныя мерапрыемствы — гэта толькі пачатак нашай дзейнасці. Мы спадзяемся, што стварэнне новай творчай арганізацыі сапраўды дасць штуршок для актывізацыі фатаграфічнага і, наогул, мастацкага жыцця краіны.

Алена СПАСЮК.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82, (тэл./факс).
Галоўны рэдактар: 8029-6-88-17-82. E-mail: golas_radzimy@tut.by

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ:
http://golas.promedia.by

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж 2 154 экз. Заказ 1528. Падпісана да друку 9. 12. 2003 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе. Знакам (R) пазначаны рэкламныя матэрыялы.

Аддрукавана на паліграфічным РУП «Чырвоная зорка» (220073, г. Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3).